

У раёнах новых забудоў вялікіх гарадоў даўно ёсць праблемы з дзіцячымі садкамі. Там жывуць шмат маладых сем'яў з дзецьмі. А што ж у вёсцы? Там, як правіла, месцаў для дашкольнікаў хапае. Але... МС



Нягледзячы на ўсе цяжкасці, эканамічныя стасункі паміж Беларуссю і Эстоніяй добрыя. Яны ўступаюць тавараабароту з суседкамі Літвой і Латвіяй, але ўзровень трымаюць. СТАР. 3



Сёлета на XIV Вільнюскім міжнародным кніжным кірмашы каля стэндаў, што экспануюць беларускую кнігу, заўсёды было шмат людзей, спецыялістаў, кнігавыдаўцоў і проста чытачоў. СТАР. 6

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

27 ЛЮТАГА 2013 г. СЕРАДА № 38 (27403) Кошт 1300 рублёў

БЕЛАРУСКАЯ ГАЗЕТА

## САВЕТУ ПА РАЗВІЦЦЮ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА НЕАБХОДНА МАДЭРНІЗАЦЫЯ

**Прэзідэнт Аляксандр Лукашэнка са шкадаваннем канстатуе, што Савет па развіцці прадпрымальніцтва не стаў генератарам канструктыўных ідэй і «лакаматывам» дынамічнага развіцця. Аб гэтым кіраўнік дзяржавы заявіў на нарадзе аб дзейнасці гэтага савета, перадае карэспандэнт БЕЛТА.**

«Амаль за дзесяцігадовую работу ў папярэднім складзе савету не ўдалося выканаць маё асноўнае патрабаванне — быць прамым сувязным звяном паміж бізнэсам і кіраўніцтвам краіны», — сказаў Прэзідэнт. «Мяркуйце самі. Перада мной пакет дакументаў, дзе справаздача аб рабоце савета з часу яго стварэння ў 1999 годзе. Як пачытаеш, дык і зроблена быццам бы не мала: пастаянныя сустрэчы з прадстаўнікамі прыватнага бізнэсу, семінары, круглыя і «квадратныя» сталы па абмеркаванні актуальных праблем, аналітычныя запіскі ва ўрад, іншыя органы ўлады, вялікі аб'ём публікацый у навукова-практычных выданнях, выступленні ў сродках масавай інфармацыі, штогадовая экспертыза нарматыўных прававых актаў і г.д.», — адзначыў кіраўнік дзяржавы. Аднак, паводле яго слоў, няма галоўнага, таго, аб чым прасіў яшчэ на першым пасяджэнні савета папярэдняга складу — уносіць прапановы непасрэдна, у тым ліку па ўдасканаленні не толькі заканадаўства, але і дзейнасці ўсёй бізнэс-супольнасці, а таксама наладзіць зваротную сувязь з прадпрымальніцкай супольнасцю.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што Савет па развіццю прадпрымальніцтва неабходна было мадэрнізаваць і «добра ўзварухнуць».

Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што гэта практычна адзіны савет, які створаны пры Прэзідэнце. Ён растлумачыў, чаму згадзіўся на стварэнне менавіта такога савета: «З'явілася шмат неразбярыхі, вельмі шмат жадаючых, а вы памятаеце тыя часы, напэўна, цяпер гэтага менш, з праваахоўных органаў, з дзяржаўных структур, чыноўнікаў, якія гатовы былі стварыць вам «дах», за кошт вас пагрэць рукі і нажыцца. Мяне такая перспектыва ніяк не задавольвае. Гэта перспектыва таксама непрымальная для дзяржавы. Таму для мяне было важна, каб новыя людзі ўпісаліся ў тую палітыку, якая праводзілася толькі з адной мэтай, каб лепш было на нашым кавалку зямлі вам і іншым людзям, якія разам з вамі працуюць. Я хацеў, каб было ўсё сумленна і прыстойна. І вы, як людзі, якія лепш за мяне ведаюць тое, што адбываецца ў бізнэс-супольнасці, павінны былі мяне інфармаваць па гэтых пытаннях». Кіраўнік дзяржавы адзначыў, што такой інфармацыі ён ад прадпрымальнікаў не атрымліваў.

Аляксандр Лукашэнка лічыць, што прадпрымальнікі — не тыя людзі, якім трэба ствараць ільготныя і цяплічныя ўмовы. «Вы мяне не папракняце, што я кагосьці з бізнэсменаў у краіне сілай прымушаў дапамагаць дзяржаве. Можаце — дапамажыце, не можаце — бог з вамі. Адпаведныя будуць адносіны з боку дзяржавы і мяне да вас», — дадаў Прэзідэнт. Ён адзначыў, што «роўнапрыбліжаны да ўсіх: бізнэсменаў, небізнэсменаў — усіх, хто хоча дабра для краіны». «Таму калі ў вас будуць нейкія праекты, патрэбныя для краіны, — калі ласка, дзверы ў мяне адчынены. Я падтрымаю», — сказаў Аляксандр Лукашэнка. «Але ні ў якім выпадку не лабіраванне нейкіх інтарэсаў, каб лягчэй жыць», — папярэдзіў Прэзідэнт. «Хачу, каб вы дакладна ўсведамлялі: любыя спробы бізнэсменаў уздзейнічаць на органы дзяржаўнай улады з мэтай стварыць «дах» для свайго добрага жыцця будуць паварочвацца крахам для такіх ініцыятыў і структур», — падкрэсліў ён.

Аляксандр Лукашэнка звярнуў увагу на тое, што для работы прадпрымальнікаў нормай павінна стаць не лабіраванне інтарэсаў асобных фірм і кампаній, а маштабная, рознабаковая, канструктыўная дзейнасць, не выбіванне льгот і датацый з бюджэту, а павелічэнне ўкладу прыватнага сектара ў вытворчасць валавога ўнутранага прадукту, у павышэнне эфектыўнасці беларускай эканомікі.

«Хачу падкрэсліць: калі нехта з бізнэсменаў будзе фінансаваць «пятую калону» або нейкім іншым спосабам аказваць негатыўны ўплыў на грамадства, то я буду лічыць, што яны ўключыліся ў палітычную барацьбу, у барацьбу супраць дзяржавы. А там — свае законы. Пасля няхай не крыўдзяцца такія бізнэсмены», — сказаў кіраўнік дзяржавы.

СТАР. 2

## БОНДАР З МІЖРЭЧЧА



Фота Анатоля КЛЕШЧУКА.

Самабытнасць Прыпяцка-Убарцкага Палесся выяўляецца не толькі ў аб'ектах унікальнай прыроды, але і ў побыце саміх палешукоў. У леташнім і пазалеташнім фестывалях аўтэнтыкі «Покліч Палесся» ў вёсцы Ляскавічы, накіраваных на выяўленне і захаванне народных традыцый, дэманстраваліся шмат вырабаў з дрэва, зробленых рукамі таленавітых майстроў, у тым ліку і бондарскія вырабы. Жыхар вёскі Іванава Слабада Леанід Міхайлавіч Прыходзька хоць і не з'яўляўся ўдзельнікам гэтых грандыёзных свят, аднак сваю бондарскую справу ён не забывае. Не забываюць яе і аднавяскоўцы майстра, бо зробленыя ім бочкі, цэбры, маслабойкі і дзежкі служаць гаспадыням па некалькі дзясяткаў гадоў.

### ЦЫТАТА ДНЯ



**Міхаіл РУСЫ, віцэ-прэм'ер:**

***«Рост канкурэнцыі ў Мытным саюзе спрыяе развіццю новых вытворчасцяў у Беларусі. Кожная краіна адчула на сабе, якую карысць ён прыносіць. Зараз краіны Мытнага саюза вядуць гаворку пра тое, як развівацца далей, выходзіць на больш высокі інтэграцыйны ўзровень. Мы імкнёмся працаваць так, як гэта робяць іншыя саюзы, як Еўрасаюз, напрыклад, але мы напрацоўваем свае стандарты, падыходы, свае меры абароны, мы павінны думаць пра сваіх людзей, якія тут жывуць і працуюць. Таму кірунак выбраны правільны, нам трэба агрэсіўна дзейнічаць у рамках гэтага аб'яднання, заяўляючы пра яго ў свеце ўсё шырэй».***

Курсы замежных валют, устаноўленыя НБ РБ з 27.02.2013 г.

| | | |
|---|---|---|
| Долар ЗША | 8610,00 | ▼ |
| Еўра | 11210,00 | ▲ |
| Рас. руб. | 281,50 | ▼ |
| Укр. грыўня | 1057,28 | ▲ |

НАДВОР'Е СЁННЯ

| | |
|---|---|
| Брэст | + 1° |
| Віцебск | – 4° |
| Гомель | – 3° |
| Гродна | – 2° |
| Магілёў | – 4° |
| Мінск | – 4° |

## «БЕЛАЯ РУСЬ» І ПОЛЬСКАЯ «САМААБАРОНА» ДАМОВІЛІСЯ АБ СУПРАЦОЎНІЦТВЕ

**Гэта першае падобнае пагадненне паміж Рэспубліканскім грамадскім аб'яднаннем «Белая Русь» і палітычнай партыяй іншай краіны.**

— Выхад на еўрапейскую палітычную арэну вельмі важны для нас, — падкрэсліў **старшыня аб'яднання «Белая Русь» Аляксандр РАДЗЬКОЎ.** — Мы будзем паслядоўна даказваць, што ў нас ёсць свае нацыянальныя інтарэсы, што мы імкнёмся жыць у супрацоўніцтве з іншымі еўрапейскімі краінамі, паважаем чужыя інтарэсы і ні на што не замахваемся, але хочам развівацца сваім уласным шляхам. Нам патрэбен вопыт палітычных дзеянняў, патрэбны саюзнікі, і партыя «Самаабарона» з'яўляецца для нас сябрам. Нас яднае тое, што мы прадстаўляем людзей, якія хочуць працаваць, зарабляць і адчуваць бяспеку. Гэта права кожнага. І наша задача — дапамагчы рэалізаваць гэтае права на практыцы.

**Старшыня партыі «Самаабарона Рэспублікі Польшча» Лех КУРАПАТВІНЬСКІ** выказаў надзею, што падпісаны дагавор — толькі пачатак у развіцці палітычнага і эканамічнага супрацоўніцтва паміж польскай партыяй і беларускім грамадскім аб'яднаннем, якое будзе на карысць абодвум славянскім народам. «Нам падабаецца стаўленне «Белай Русі» да моладзевай палітыкі, вырашэння пытанняў, звязаных з занятасцю, працаўладкаваннем, адукацыяй. Вярнуўшыся дадому, мы распавядзём пра тое, што бачылі, а таксама пра тое, што некаторыя польскія СМІ дарма крытыкуюць Беларусь. Мы можам гаварыць пра палітычныя адрозненні, але для нас важна, што ў нас аднолькавыя падыходы да вырашэння глабальных пытанняў эканамічнага ўзаемадзеяння, адукацыйнай і культурнай палітыкі,» — сказаў ён.

Кіраўнік «Самаабароны» дадаў, што партыю, якая адначасова з'яўляецца аграрным прафсаюзам, цікавіць таксама супрацоўніцтва з Беларуссю ў сельскай гаспадарцы. «Мы наведалі беларускія малаказавод і агракамбінат і былі ўражаны высокім ўзроўнем вытворчасці, які адпавядае еўрапейскім стандартам», — сказаў ён.



Пагадненне гэта рыхтавалася чатыры гады — столькі спатрэбілася часу, каб дакладна сфармуляваць, што кожны бок жадае ад супрацоўніцтва. Падпісанне дакумента таксама дэманструе, што «Белая Русь» саспела для зносін не толькі з суседзямі па СНД, але і для ўдзелу ў палітычным руху партый Еўрасаюза. Падобна, што дагавор з польскай «Самаабаронай» — толькі першая ластаўка ў гэтым працэсе.

— Мы павінны шукаць любую магчымасць даносіць праўдзівую інфармацыю пра сваю краіну, — падкрэсліў **намеснік старшыні рады Рэспубліканскага грамадскага аб'яднання «Белая Русь», віцэ-спікер ніжняй палаты беларускага парламента Віктар ГУМІНСКІ.** — На нядаўняй сустрэчы з кіраўніцтвам Аўстрыйскай партыі свабоды мы пачулі такое меркаванне пра Беларусь: «Ваша «праблема» ў тым, што вы засталіся незалежнай дзяржавай, а сёння гэта не вітаецца». Нам блізкая пазіцыя гэтай партыі ў тым, што кожная краіна павінна мець права выбару сваёй ступені незалежнасці і ўласнага інтэграцыйнага шляху, таму, думаю, мы будзем мець добрыя перспектывы ў супрацоўніцтве і з ёй.

**Вольга МЯДЗВЕДЗЕВА.**

■ Абітурыент—2013

## ГАЛОЎНАЯ НАВІНА ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ — НОВЫ НІЖНІ ПАРОГ ТЭСТАВАГА БАЛА

**«Правілы прыёму ў вышэйшыя і сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы ў бягучым годзе не зменяцца, — заявіў падчас прэс-канферэнцыі ў Нацыянальным прэс-цэнтры міністр адукацыі Сяргей Маскевіч, — але ніжні парог тэставага бала для прэтэндэнтаў на вышэйшую адукацыю будзе павышаны».**

Для таго, каб мець магчымасць падаць дакументы ў ВНУ, абітурыенты павінны будуць набраць не менш як 10 балаў па рускай і беларускай мове, 15 балаў — па матэматыцы, фізіцы, хіміі і біялогіі і 20 балаў — па гісторыі Беларусі, сусветнай гісторыі найноўшага часу, грамадазнаўстве, геаграфіі і замежных мовах.

— Станоўчыя значэнні тэставых балаў вызначаліся з улікам праведзенага аналізу вынікаў цэнтралізаванага тэсціравання за два апошнія гады, — патлумачыў міністр. — Мы аналізавалі працэнт выканання заданняў у тэстах і ўзровень складанасці заданняў, згодна са спецыфікацыямі па розных вучэбных прадметах, у адпаведнасці з якімі складаліся тэставыя заданні, а таксама правялі аналіз вынікаў конкурснага адбору ва ўстановы вышэйшай адукацыі ў 2011-м і 2012-м гадах. Мы ўпэўнены, што ўстаноўлены мінімальны ўзровень тэставых балаў дазволіць не прапусціць у кола студэнтаў слаба падрыхтаваных абітурыентаў. Па нашых папярэдніх падліках, каля 30% абітурыентаў могуць не дасягнуць гэтага парога. Затое яны змогуць працягнуць навучанне ў прафесійна-тэхнічных і сярэдніх спецыяльных навучальных установах. Як сведчыць міжнародная практыка, праграму вышэйшай школы здольныя засвойваць толькі прыкладна 40% выпускнікоў школ.

Між іншым, на ўваходзе ў сярэднія спецыяльныя навучальныя ўстановы ўдзельнікам цэнтралізаванага тэсціравання дастаткова будзе набраць усяго 1 бал, што, безумоўна, можна лічыць вельмі ўмоўнай перашкодай.

СТАР. 2

■ Чытач — газета

## ЁСЦЬ ПЫТАННІ? ПРЫХОДЗЬЦЕ!

**Не вам казаць: калі ў чалавека няма праблем са здароўем і жыллём, усе іншыя — цалкам вырашальныя... Калі ёсць...**

Рэдакцыя газеты «Звязда» аднаўляе традыцыю так званых «Выязных прыёмных». Першая з іх пройдзе ў Стаўбцоўскім райвыканкаме — **сёння, 27 лютага, з 11 да 13 гадзін.** Удзел у ёй возьмуць намеснік начальніка галоўнага ўпраўлення арганізацыі медыцынскай дапамогі Міністэрства аховы здароўя Людміла Аверкіеўна ЖЫЛЕВІЧ, галоўны спецыяліст упраўлення юрыдычнай працы і кадраў Міністэрства жыллёва-камунальнай гаспадаркі Вольга Аляксандраўна ГЕРМАН, а таксама намеснік галоўнага рэдактара газеты «Звязда» Вікенцій Альфрэдавіч КЛЮЧНІК і яе спецыяльныя карэспандэнты.

Прыязджайце, калі ёсць пытанні ці прапановы... Прыходзьце!

**P.S.** *З 14.30 да 16.00 прыём грамадзян будзе праводзіцца на прадпрыемстве электрычных сетак.*

## ХРОНІКА АПОШНІХ ПАДЗЕЙ

### РАСІЯНЕ ЗА ЗАКОН АБ РАХУНКАХ ЧЫНОЎНІКАЎ



Большасць расіян станоўча ацаніла законапраект, які забараняе айчынным чыноўнікам мець за мяжой банкаўскія рахункі і каштоўныя паперы. 80% жыхароў Расіі выступілі за ініцыятыву прэзідэнта Уладзіміра Пуціна, аднак думкі аб эфектыўнасці закона падзяліліся. 40% думаюць, што ён можа стаць дзейснай антыкарупцыйнай мерай, столькі ж упэўнены, што многія чыноўнікі знойдуць спосабы абысці і гэты закон. Большасць рэспандэнтаў падтрымлівае прапановы па ўзмацненні жорсткасці законапраекта аб забароне замежных рахункаў і каштоўных папер. 83% выступілі за ўвядзенне буйных штрафаў і крымінальнай адказнасці, 76% падтрымалі пашырэнне пераліку забароненых аб'ектаў за кошт уключэння ў яго замежнай нерухомасці, а 75% ухвалілі распаўсюджванне дзеяння закона на дзяцей і іншых блізкіх сваякоў чыноўнікаў. 22 лютага Дзярждума прыняла ў першым чытанні пакет законапраектаў, якія забараняюць высокапастаўленым чыноўнікам і парламентарыям мець рахункі ў замежных банках і каштоўныя паперы замежных эмітэнтаў.

### У ЕГІПЦЕ ЎПАЎ ПАВЕТРАНЫ ШАР



У егіпецкім старажытным горадзе Луксор на вышыні каля 300 м адбыўся пажар на борце паветранага шара. Загінулі 14 чалавек, яшчэ чацвёра турыстаў лічацца прапаўшымі без вестак. Усяго ў карзіне лятальнага апарата знаходзіўся 21 чалавек — пілот і 20 турыстаў. Сярод ахвяр катастрофы французы, брытанцы, японцы і жыхары Ганконга. Двум турыстам і пілоту ўдалося выскачыць, яны атрымалі шматлікія траўмы і знаходзяцца ў цяжкім стане. Людзі выскоквалі з ахопленага полымем шара з вышыні сяміпавярховага дома. Паводле папярэдніх звестак, узгаранне шара адбылося з-за разрыву газавага шланга.

### МЕТЭАРЫТУ ПАСТАВЯЦЬ ПОМНІК

Улады Чалябінскай вобласці прынялі рашэнне ўсталяваць у горадзе помнік метэарыту, які выбухнуў над Уралам. У хуткім часе будзе сфарміравана каманда па распрацоўцы праектаў, а мясцовыя жыхары змогуць прадставіць свае варыянты манумента. Распрацоўваецца палажэнне аб конкурсах па стварэнні макетаў помніка і графічнага лагатыпа.

ISSN 1990 - 763X

13038>

9 771990 763008

ПАДРАБЯЗНАСЦІ

### АДНА ТАЛЕРКА КАШЫ ПРАДУХІЛІЦЬ ХРАНІЧНЫЯ ХВАРОБЫ

Прадукты з цэлага зерня незаслужана абыходзяць бокам, упэўнены навукоўцы, якія даследуюць антыаксіданты. На іх думку, талерка кашы дапамагае абараніць сябе ад дыябету і хвароб сэрца. Прафесар Стэфан Ліліоя з Даследчага інстытута Ілавара знарок прааналізаваў 11 даследаванняў, прысвечаных спажыванню цэльназерневых прадуктаў.

Справаздачы ахопліваюць сотні людзей, за якімі сачылі больш за 10 гадоў. Аказалася, людзі, якія спажываюць 40—50 грамаў цэлага зерня, больш за астатніх былі абаронены ад хранічных захворванняў. У вялікай талерцы кашы прыкладна 45 грамаў злакаў. Аднак 80% чалавек не спажываюць злакі ў патрэбнай колькасці. Між тым, чым больш чалавек іх есць, тым большы эфект. Галоўнае, каб зародак і вотруб'е не выдаляліся (у вотруб'і змяшчаецца порцыя злучэнняў, неабходных для росту зерня).



У адваротным выпадку моцна знізіцца пажыўная каштоўнасць і скароціцца колькасць клятчаткі, карыснай для кішэчніка.

## У НЯСВІЖСКАГА РАЁНА ЁСЦЬ НЕ ТОЛЬКІ МІНУЛАЕ І СУЧАСНАСЦЬ, АЛЕ І БУДУЧЫНЯ

Гэты раён здзіўляе сваімі працоўнымі рэкордамі, прываблівае культурнай унікальнасцю, робіць стаўку на моладзь

**Мінулы год аказаўся вельмі ўдалым для Нясвіжскага раёна. Яго жыхары і ўдарна папрацавалі, дасягнуўшы самай высокай ураджайнасці за ўсю яго гісторыю, і мелі магчымасць добра адпачыць, наведваючы шматлікія культурныя мерапрыемствы — бо Нясвіж у 2012 годзе меў тытул культурнай сталіцы нашай краіны. А наперадзе — новы 2013-ы і новыя планы, ідэі, задумкі... Пра вынікі і новыя планы мы гаворым са старшынёй Нясвіжскага райвыканкама Іванам КРУПКО.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

***— 2012-ы быў паспяховым годам для Нясвіжскага раёна. Дзякуючы чаму? Якія складнікі поспеху вы маглі б вылучыць?***

— Адразу скажу, што годнае становішча нашага раёна ў вобласці і рэспубліцы заснавана перш за ўсё на адказным стаўленні людзей да справы. А раённы выканаўчы камітэт, у сваю чаргу, заўсёды імкнуўся і імкнецца заўважыць і па заслугах ацаніць чалавека працы, таго, хто робіць сваю справу добрасумленна.

***Знакавыя падзеі мінулага года вачыма Івана Крупко***

1) Адкрыццё Нясвіжскага замка.
2) Той факт, што ў 2012 годзе Нясвіж меў тытул культурнай сталіцы Беларусі.
3) Год найвышэйшай ураджайнасці ў раёне.

Летась усе мы папрацавалі на славу — ад работніка і да кіраўніка. Ды і надвор'е не падвяло. У выніку ўраджайнасць збожжавых, зернебабовых (з улікам зерня кукурузы) упершыню за ўсю гісторыю раёна дасягнула ў сярэднім 75 цэнтнераў з гектара. У 2011 годзе, таксама ўраджайным, мы атрымалі 179 тысяч тон збожжа, а летась — больш за 200 тысяч тон. Гэта адно з найвышэйшых дасягненняў раёна і значны паказчык для ўсіх нас.

Мы годна выканалі дзяржзаказ, забяспечылі краіну пшаніцай і іншымі збожжавымі. Раён у 2012 годзе прадаў дзяржаве 19 тысяч тон харчовай пшаніцы з высокім працэнтам клейкавіны, больш за 7 тысяч тон піваварнага ячменю высокай якасці, больш за 3,5 тысячы тон трыцікале на спіртавыя заводы і каля 7 тысяч тон насеннага матэрыялу. Найвышэйшая ўраджайнасць збожжавых была атрымана ў сельскагаспадарчым вытворчым кааператыве «Агракамбінат Сноў», а таксама ў адкрытых акцыянерных таварыствах «Новае жыццё», «17 верасня» і «Сейлавічы».

СТАР. 3

# САВЕТУ ПА РАЗВІЦЦІ ПРАДПРЫМАЛЬНІЦТВА НЕАБХОДНА МАДЭРНІЗАЦЫЯ

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Аляксандр Лукашэнка адзначыў, што нормай жыцця для прадпрымальнікаў павінен быць удзел у сацыяльных праграмах. «Тады людзі будуць вас паважаць. І не давядзецца разважаць аб негатыўным іміджы бізнэсменаў», — лічыць прэзідэнт. Ён расказаў, што спецыяльна прасіў сфарміраваць савет без удзелу дзяржслужачых і чыноўнікаў, за выключэннем старшыні, каб гэта структура не была «кішэннай». «Вы — людзі, якія ўжо адбыліся ў бізнэсе. І для мяне вельмі важна чуць ваша меркаванне па найбольш актуальных пытаннях сацыяльна-эканамічнай палітыкі. Прычым мне асабліва цікавы альтэрнатыўны пункт гледжання, які адрозніваецца ад пункту гледжання ўрада і іншых чыноўнікаў», — сказаў кіраўнік дзяржавы. Ён адзначыў, што чакае ад удзельнікаў нарады прапаноў, але не па прыватных, а па агульных пытаннях, па тых, якія павінен вырашаць Прэзідэнт або на якія ён павінен звяртаць асаблівую ўвагу.

Аляксандр Лукашэнка падкрэсліў, што важнейшая задача савета — актыўна ўплываць на прадпрымальнікаў, разумна даводзіць да іх дзяржаўную палітыку, каб забяспечваць аптымальнае спалучэнне інтарэсаў грамадства і бізнэсу, ствараць умовы для цывілізаванага рынку, падтрымліваць вытворцаў тавараў і паслуг, а не спекуляцыйны бізнэс.

Прэзідэнт звярнуў увагу і на той факт, што мадэрнізацыя эканомікі з'яўляецца задачай не толькі дзяржаўнага сектара. На яго думку, у яе вырашэнне неабходна ўключыць увесь айчынны бізнэс і максімальную колькасць замежных інвестараў. «Рашэнні, прынятыя намі сёння, павінны кардынальна палепшыць работу савета, каб яна адпавядала высокім сучасным патрабаванням», — сказаў Прэзідэнт.

# ПАЙШОЎ З ЖЫЦЦЯ ВЯДОМЫ ГЕНКАНСТРУКТАР АЎТАТЭХНІКІ МІХАІЛ ВЫСОЦКІ



**Прэзідэнт Беларусі Аляксандр Лукашэнка ў сувязі са смерцю акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, выдатнага вучонага і канструктара, грамадскага дзеяча, Героя Беларусі Міхаіла Высоцкага накіраваў спачуванні яго жонцы, родным, блізкім і калегам. Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў прэс-службе беларускага лідара.**

**Як адзначаецца ў спачуванні, Міхаіл Высоцкі заслужыў прызнанне і аўтарытэт не толькі як таленавіты даследчык і кіраўнік, але і як сумленны, прынцыповы і справядлівы чалавек. Яго смерць — гэта незаменная страта для беларускай навукі.**

Міхаіл Сцяпанавіч Высоцкі вядомы як выдатны канструктар, які стварыў айчынную школу канструявання і даследаванняў грузавых аўтамабіляў, вядомы вучоны ў галіне механікі і комплекснага праектавання мабільных машын. З імем Міхаіла Высоцкага звязаны найбольш значныя дасягненні Мінскага аўтазавода: распрацоўка прынцыпова новай кампаноўкі вялікагрузных аўтамабіляў «кабіна над рухавіком», стварэнне канцэптуальнага модульнага аўтацягніка МАЗ-2000 «Перабудова», які атрымаў залаты медаль на Парыжскім салоне аўтамабілебудавання ў 1988 годзе, стварэнне шасці пакаленняў магістральных аўтапаяздоў .

Міхаіл Высоцкі апублікаваў больш за 450 навуковых прац. Ім атрымана 145 аўтарскіх пасведчанняў і патэнтаў, большасць з якіх паслужылі асновай для павышэння канкурэнтаздольнасці і стварэння новых відаў аўтатрактарнай тэхнікі. Міхаілам Высоцкім падрыхтавана 6 дактароў, 18 кандыдатаў навук і створана беларуская школа механікі і комплекснага праектавання мабільных машын, якая атрымала шырокае міжнароднае прызнанне. Міхаіл Высоцкі ўзнагароджаны дзяржаўнымі прэміямі СССР (1970) і БССР (1986). Яму прысвоены ганаровыя званні «Заслужаны дзеяч навукі і тэхнікі БССР» (1976) і «Заслужаны работнік прамысловасці СССР» (1991). Канструктар узнагароджаны ордэнамі: Працоўнага Чырвонага Сцяга (1967), Леніна (1974), Айчыны III ступені (1998) і II ступені (2004). У 2002 годзе ён атрымаў падзяку Уладзіміра Пуціна за ўзорнае выкананне воінскага абавязку і самаадданае служэнне Айчыне. У 2006 годзе ўказам Прэзідэнта Беларусі Міхаілу Высоцкаму прысвоена званне «Герой Беларусі». У 2008 годзе яму аб'яўлена падзяка кіраўніком дзяржавы за шматгадовую плённую, высокаэфектыўную навукова-тэхнічную дзейнасць.

**Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуе ў сувязі са смерцю вядомага беларускага вучонага, дзяржаўнага і грамадскага дзеяча, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі, Героя Беларусі Высоцкага М.С. і выказвае глыбокія спачуванні яго родным і блізкім.**

**Дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь глыбока смуткуюць у сувязі са смерцю намесніка дырэктара па навуковай рабоце ў галіне аўтамабільнай і кар'ернай тэхнікі дзяржаўнай навуковай установы «Аб'яднаны інстытут машынабудавання Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі», Героя Беларусі, генеральнага канструктара па аўтамабільнай тэхніцы Рэспублікі Беларусь, акадэміка Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі Высоцкага Міхаіла Сцяпанавіча і выказваюць шчырае спачуванне яго родным і блізкім.**

*Уважаемые акционеры ОАО «Мостоотряд №88»*

**28 марта 2013 года**
**СОСТОИТСЯ ОЧЕРЕДНОЕ ОБЩЕЕ СОБРАНИЕ АКЦИОНЕРОВ**

**ОАО «Мостооряд №88»**

Собрание пройдет по адресу:
г. Минск, ул. Промышленная, д. 16, третий этаж, актовый зал.

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности Общества в 2012 году и об основных направлениях деятельности Общества в 2013 году.
2. Отчет о работе наблюдательного совета в 2012 году. Оценка деятельности Директора Общества наблюдательным советом.
3. Утверждение аудиторской проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2012 год, заключение ревизионной комиссии по результатам проверки деятельности Общества за 2012 год.
4. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках Общества за 2012 год.
5. Утверждение порядка распределения прибыли, остающейся в распоряжении предприятия за 2012 год. О выплате дивидендов за 2012 год.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли Общества в 2013 году. О выплате дивидендов за 2013 год.
7. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества.
8. Определение условий вознаграждения и компенсации для членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. О внесении изменений в Устав ОАО «Мостоотряд № 88».

С материалами, подготовленными к собранию, можно ознакомиться по указанному выше адресу в рабочие дни с 20 марта 2013 г. с 13.00 до 16.45 по месту нахождения Общества у председателя наблюдательного совета, а в день собрания – в помещении, где оно будет проводиться – в актовом зале в здании управления на третьем этаже.

Регистрация участников собрания **с 15.00 до 15.25** по месту проведения собрания.

**Начало работы собрания – 28 марта 2013 года в 15.30.**

Список акционеров для участия в собрании будет составлен по состоянию **на 19 марта 2013 года.**

Для регистрации при себе иметь следующие документы: акционеру Общества – паспорт, представителю акционера – паспорт и доверенность.

УНП 100299744 *Наблюдательный совет*

# «БАНКІ ПАВІННЫ БОЛЬШ АКТЫЎНА ЗВЯРТАЦЦА Ў ТРАЦЕЙСКІЯ СУДЫ»

**Такую думку на прэс-канферэнцыі выказаў старшыня Вышэйшага Гаспадарчага Суда Беларусі Віктар КАМЯНКОЎ. Пры гэтым падкрэсліў, што патэнцыял трацейскіх судоў у нашай краіне выкарыстоўваецца толькі на 3-5%.**

Паводле слоў Віктара Сяргеевіча, сёння ў краіне створана 17 трацейскіх судоў. Аднак пакуль яны задзейнічаны далёка не ў поўнай меры.

— Лічу, што, напрыклад, банкі, якія часта звяртаюцца ў суды, каб спагнаць крэдыты з грамадзян, павінны больш актыўна выкарыстоўваць магчымасці трацейскіх судоў, — адзначыў Віктар Камянкоў. — Трацейскія суды павінны працаваць не толькі ў сістэме эканамічных адносін, але і ў сістэме грамадзянска-прававых, шлюбна-сямейных і г.д.

**— А што перашкаджае развіццю трацейскага правасуддзя ў Беларусі?** — пацікавіліся журналісты.

— Маюцца некаторыя цяжкасці з разуменнем нюансаў нашага заканадаўства, у прыватнасці, ці абкладаецца падаткам адпаведная аплата трацейскага суддзі, якія памеры гэтай аплаты, — сказаў Віктар Камянкоў. — Гэтыя і іншыя пытанні пакуль з'яўляюцца своеасаблівым тормазам. Для таго, каб павысіць патэнцыял трацейскіх судоў, трэба, лічу, у гаспадарчых дагаворах увесці арбітражную агаворку разгляду справы ў трацейскім судзе. Банкі таксама павінны рабіць такую агаворку, калі яны заключаюць крэдытны дагавор з грамадзянінам.

Там павінна быць прапісана, у якім канкрэтным выпадку можна звярнуцца ў трацейскі суд. І чалавек ужо выбірае: альбо на працягу некалькіх месяцаў разглядаць справу ў дзяржаўным судзе, альбо больш хутка вырашыць праблему ў трацейскім.

— Чакаць ініцыятывы ад грамадзяніна, каб ён аддаў перавагу трацейскаму суду замест дзяржаўнага, пакуль не варта: мы маем не той узровень менталітэту, — падкрэсліў старшыня ВГС. — Тое ж самае тычыцца і пазасудовай і дасудовай медыяцыі. Лічу, што па некаторых катэгорыях спрэчак варта было б увесці абавязковую медыяцыю ці іншую форму добраахвотнага вырашэння спрэчак. Але рабіць гэта не ў адзін момант, а паступова.

У прыватнасці, маю на ўвазе карпаратыўныя спрэчкі. Дапусцім, што мы з вамі стварылі гаспадарчае таварыства — гэта наш прыватны інтарэс, нашы прыватныя грошы. На нейкім этапе ў нас узнікла спрэчка. Дык навошта ж нам звяртацца ў дзяржаўны суд і надаваць нашай спрэчцы публічнасць?

Па словах Віктара Камянкова, дзяржаўныя суды зацікаўлены ў развіцці альтэрнатыўных спосабаў вырашэння спрэчак. Каб падтрымаць гэтае развіццё, Цэнтр вырашэння канфліктаў пры ўдзеле ВГС пачаў падрыхтоўку пазасудовых медыятараў, прапрацоўваецца пытанне аб арганізацыі вучобы для трацейскіх суддзяў, рыхтуецца да другога чытання праект закона «Аб медыяцыі», каментар да закона «Аб трацейскіх судах».

**Надзея ДРЫЛА.**

# ВІЦЕБСКІ ЕПІСКАП СЫХОДЗІЦЬ РАЗАМ З ПАПАМ?

**Літаральна на днях Папа Рымскі Бенядыкт XVI прыняў прашэнне епіскапа Уладзіслава Бліна аб адстаўцы з кіравання Віцебскай дыяцэзіяй. Паралельна Папа прызначыў Апостальскім адміністратарам тамтэйшай дыяцэзіі ксяндза прэлата Францішка Кіселя.**

— Нечаканая навіна, — кажа пісьменніца Ірына Жарнасек. — Епіскап Уладзіслаў меў пэўныя праблемы са здароўем. Было відаць, як ён пераступаў праз гэта. Але ён заўжды кажа: «Калі цяжка, усё роўна ўсміхайцеся». Гэта яго правіла.

Епіскапам Віцебскай дыяцэзіі Уладзіслава Бліна Папа Ян Павел II прызначыў дэкрэтам у 1999 годзе. Дагэтуль ураджэнец польскага Свідвіна, бацькі якога паходзілі з Беларусі, працаваў прабашчам магілёўскага кафедральнага касцёла Унебаўзяцця Найсвяцейшай Панны Марыі, заснаваў вядомы міжнародны фестываль хрысціянскай музыкі «Магутны Божа». У 2007-м атрымаў прэмію «За духоўнае адраджэнне». Зараз епіскап знаходзіцца на лячэнні ў ЗША.



Папа Бенядыкт XVI і епіскап Уладзіслаў Блін

Ксёндз Францішак Кісель паходзіць з Глыбоччыны, з Мосара. Вучыўся ў Віцебскім тэхнікуме сувязі, служыў у войску, скончыў Вышэйшую духоўную семінарыю ў Рызе. Працаваў у латвійскай Аглоне, Браславе, а з пачатку 90-х шчыруе ў Полацку. Летась адзначыў 25-годдзе свайго святарства. Да адстаўкі епіскапа Уладзіслава быў Генеральным вікарыем Віцебскай дыяцэзіі.

— Францішак Кісель добры святар, — разважае спадарыня Ірына. — Ксёндз Францішак прыйшоў у святарства тады, калі яно не было шырока папулярным. Чула ад яго, як у дзяцінстве маці вяла яго ў касцёл, у Глыбокае, і хавала пад плашчом, бо дзецям забаранялася прысутнічаць на імшы. Ён — новая старонка каталіцтва на Полаччыне. Дзякуючы ксяндзу Францішку ў Полацку пабудавалі касцёл святога Андрэя Баболі. Прыязджаў да нас маліцца ў Наваполацк, дзе пасля заснаваў парафію Найсвяцейшага сэрца Езуса.

**— У інтэрнэт-прасторы кс. Францішка называюць беларусам па перакананні. Ці сапраўды гэта так?**

— Безумоўна, ён шануе мову і служыць па-беларуску. У штодзённым жыцці таксама актыўна карыстаецца беларускай мовай, цікавіцца гісторыяй Касцёла на Беларусі. У яго сапраўды здаровая беларуская ментальнасць.

**Тарас ШЧЫРЫ.**

**Даведка «Звязды».** *Апостальскі адміністратар — прызначаны Папам Рымскім кіраўнік Апостальскай адміністратуры ці часовы выканаўца епіскапскіх абавязкаў у вакантнай ці занятай дыяцэзіі.*

# ВЫРАСЦЕ БАЦЬКОЎСКАЯ ПЛАТА ЗА ДЗІЦЯЧЫ САДОК

**У адпаведнасці з Пастановай Савета Міністраў №123 ад 25 лютага 2013 года, плата бацькоў за харчаванне дзяцей у дзіцячых садках павялічваецца на 50%. Пастанова ўступае ў дзеянне з 1 сакавіка.**

Як патлумачылі журналісту «Звязды» ў галоўным адукацыйным ведамстве, калі да апошняга часу бацькі аплачвалі толькі 40% ад кошту харчавання дзяцей у дзіцячых садках, то цяпер яны будуць пакрываць 60% ад дзейных грашовых нормаў выдаткаў на харчаванне аднаго выхаванца.

Ва ўстановах дашкольнай адукацыі з 12-гадзінным рэжымам знаходжання дзяцей памер месячнай бацькоўскай платы складзе 178,2 тысячы рублёў на дзіця ва ўзросце ад 1 да 3 гадоў і 214,9 тысячы рублёў — для дзяцей ва ўзросце ад 3 да 6 гадоў. Ва ўстановах дашкольнай адукацыі з рэжымам знаходжання дзяцей 10,5 гадзіны бацькі павінны будуць уносіць за харчаванне дзіцяці ва ўзросце ад 1 да 3 гадоў 136,7 тысячы рублёў, і ад 3 да 6 гадоў — 173,4 тысячы рублёў.

Нагадаем, што пытанне аптымізацыі ўдзелу бацькоў у аплаце харчавання дзяцей абмяркоўвалася ў розных аўдыторыях і на самых розных узроўнях на працягу некалькіх апошніх гадоў. Былі прапановы ўвесці дыферэнцаваную плату ў залежнасці ад даходаў сям'і або перайсці на прынцыпова новы падыход да аплаты за ўтрыманне дзіцяці ў дашкольнай установе, калі «цана» будзе залежаць ад якасці паслугі.

Узнімалася гэта праблема і на студзеньскай калегіі Міністэрства адукацыі з удзелам віцэ-прэм'ера беларускага ўрада Анатоля Тозіка. У прыватнасці, на калегіі не ўтойвалася тая інфармацыя, што **грашовыя** нормы на харчаванне дзяцей сёння адстаюць ад **натуральных**: натуральныя нормы выконваюцца ў сярэднім толькі на 85,4 працэнта. А, як вядома, бацькоўская плата за дзіцячы садок залежыць **ад устаноўленых грашовых** нормаў на харчаванне: калі павышаюцца грашовыя нормы на харчаванне выхаванцаў — прапарцыянальна павышаюцца і выдаткі бацькоў.

Агучваўся на калегіі і адзін з найбольш верагодных варыянтаў павелічэння фінансавага ўдзелу бацькоў ва ўтрыманні дзяцей у дашкольных установах — паэтапнае павышэнне пакрыцця выдаткаў на харчаванне дзяцей (на першым этапе з 40 да 60—70%). Урад спыніўся на лічбе 60%. У выніку памер бацькоўскай платы вырас у 1,5 раза. Зразумела, што ўсім бацькам хочацца, каб іх дзеці атрымлівалі харчаванне, якое б у поўнай ступені адпавядала натуральным нормам, вызначаным для кожнага ўзросту. Але ці гатовы бацькі кампенсаваць і 100% выдаткаў на харчаванне сваіх дзяцей?

**Надзея НІКАЛАЕВА.**



Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ.

## ■ Май на ўвазе!

### ДЭКЛАРАЦЫЮ АБ СУКУПНЫМ ДАХОДЗЕ ТРЭБА ПАДАЦЬ ДА 1 САКАВІКА

Абавязкова гэта павінны зрабіць тыя фізічныя асобы, якія атрымалі даходы за мяжой ці з-за мяжы. Падаць дэкларацыю неабходна і тым, хто на працягу 5 гадоў прадаў іншым фізасобам другую кватэру ці другі жылы дом; тым, хто летась прадаў грузавік, аўтобус або другую легкавую машыну.

Дэкларацыю можна падаць асабіста ці праз прадстаўніка. У інспекцыю яе можна накіраваць па пошце і ў электронным выглядзе. Форму дэкларацыі можна знайсці на сайце www.nalog.gov.by. Даплаціць падаходны падатак на падставе дэкларацыі неабходна да 15 мая.

**Сяргей КУРКАЧ** ■

# ГАЛОЎНАЯ НАВІНА ДЛЯ АБІТУРЫЕНТАЎ — НОВЫ НІЖНІ ПАРОГ ТЭСТАВАГА БАЛА

**(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)**

Нагадаем, што летась устаноўлены на цэнтралізаваным тэсціраванні парог у 7 тэставых балаў не змаглі пераадолець больш як 18 тысяч абітурыентаў ВНУ.

Сяргей Маскевіч паведаміў, што Міністэрства адукацыі плануе паступова звесці да мінімуму няпрофільную бюджэтную падрыхтоўку ў ВНУ. Так, у 2013 годзе ў 18 ВНУ будзе закрыты прыём па некаторых эканамічных спецыяльнасцях («сусветная эканоміка», «менеджмент», «камерцыйная дзейнасць», «бухгалтарскі ўлік, аналіз і аўдыт» і іншых). А ўсе бюджэтныя рэсурсы будуць кінуты на запатрабаваныя, высокатэхналагічныя і новыя спецыяльнасці ў сферы IT, атамнай энергетыкі, нанаматэрыялаў і нанатэхналогій, біятэхналогій, касмічных тэхналогій, будаўніцтва і іншых.

Усяго на бюджэтную форму навучання ў ВНУ плануецца прыняць 30,5 тысячы чалавек: у тым ліку на дзённую бюджэтную форму навучання — 23,6 тысячы чалавек і на завочную — 6,9 тысячы чалавек. Як запэўніў міністр, скарачэнне аб'ёмаў бюджэтнай падрыхтоўкі ў ВНУ адбылося прапарцыянальна змяншэнню колькасці выпускнікоў агульнаадукацыйных устаноў. Калі летась навучальныя ўстановы выпусцілі 64 тысячы адзінаццацікласнікаў, то сёлета атэстаты аб агульнай сярэдняй адукацыі атрымаюць каля 60 тысяч чалавек.

**Надзея НІКАЛАЕВА.**

## ■ Меркаванне

# ЭФЕКТЫЎНАСЦЬ У ІМЯ СПРАВЯДЛІВАСЦІ

## СУЧАСНАЯ САЦЫЯЛЬНАЯ ПАЛІТЫКА ПАТРАБУЕ ІНШЫХ ПАДЫХОДАЎ ДА ЭКАНАМІЧНАГА РАЗВІЦЦЯ



Праблема «ўтрыманства», якая на самой справе з'яўляецца прыватнай праявай сацыяльнага крызісу ў Беларусі, мае прынцыповае значэнне для сучаснасці і будучыні беларускай дзяржавы. Гэта звязана не толькі з тым, што ідэал сацыяльнай справядлівасці быў асновай грамадскага ладу Беларусі, як мінімум, з 1917 года, але і з тым, што паспяховае вырашэнне сацыяльных праблем — неабходная ўмова выжывання беларускай дзяржавы сёння.

Сучасная сацыяльная палітыка патрабуе прынцыпова новага, больш высокага ўзроўню сацыяльна-інжынерных тэхналогій і інфраструктурнай падтрымкі. Таму здольнасць не разбураць уласную сацыяльную сферу, а забяспечваць узнаўленне і грамадскае развіццё можна аднесці да важнейшых крытэрыяў тэхналагічнай і эканамічнай канкурэнтаздольнасці дзяржавы.

Чым характарызавалася «старая» сацыяльная палітыка?

Тым, што гэта была палітыка пераважна кампенсацыйнага тыпу. Сутнасць яе ў тым, каб альбо абараніць грамадзян ад негатыўнага ўплыву рынкавых адносін, альбо кампенсаваць такі ўплыў праз рознага роду трансферы. З пункту гледжання эканомікі такая сацыяльная палітыка ўяўляла сабой сістэму пераразмеркавання грамадскага багацця на карысць тых, хто не мае магчымасці атрымаць долю гэтага багацця, дастатковую для пражывання, падаўжэння свайго роду і гэтак далей.

Гэтая класічная апазіцыя «рынак — сацыяльная сфера» цяпер прыйшла да свайго крызісу не толькі ў Беларусі, але і па ўсім свеце. Калі паглядзець на эканамічныя дыскусіі паміж рэспубліканцамі і дэмакратамі ў ЗША, то акажацца, што і там у цэнтры ўвагі тое ж пытанне: даць волю бізнэсу, які, працуючы на сябе, будзе памнажаць грамадскае багацце, альбо павялічыць падаткі, каб можна было дапамагчы тым, хто знаходзіцца ў хісткім становішчы. Абодва шляхі пройгрышныя.

**Дэградацыя авіяпрама каштавала Расіі каля 1 млн дадатковых смерцяў пераважна мужчын у працаздольным узросце.**

З аднаго боку, вялікі бізнэс, атрымліваючы падатковыя льготы, робіць багатых багацейшымі, жорстка і бескампрамісна падвяргаючы аўтсорсінгу і «аптымізацыі» ўсё, што не прыносіць яму прыбытак. У выніку сродкаў для падтрымкі неабароненых слаёў насельніцтва ўзяць няма адкуль. З іншага боку, павелічэнне падаткаў вядзе да ўцёкаў бізнэсу з краіны, разбурэння высокакваліфікаваных працоўных месцаў і як вынік — дэградацыі як эканомікі, так і сацыяльнай сферы.

Можна прывесці іншы вельмі паказальны прыклад. У Расійскай Федэрацыі сёння не сціхаюць дыскусіі аб лёсе авіяцыйнай прамысловасці гэтай краіны. Калі ў неабходнасці развіцця ваеннага самалётабудавання ніхто не сумняваецца (хоць і ў гэтай сферы ёсць вельмі сур'ёзныя праблемы), то грамадзянскае самалётабудаванне фактычна пазбаўлена падтрымкі дзяржавы. Пры гэтым расійскі ўрад і асабіста Дзмітрый Мядзведзеў працягваюць узмоцнена лабіраваць зніжэнне імпартных пошлін на ўвоз самалётаў замежнай вытворчасці. У выніку за 10 апошніх гадоў доля расійскіх самалётаў у авіяперавозках ў Расіі знізілася ў 10 разоў.

На аснове гэтых звестак кіраўнік Інстытута дэмаграфіі, міграцыі і рэгіянальнага развіцця Юрый Крупноў зрабіў парадаксальную, здавалася б, выснову: такая дэградацыя авіяпрама каштавала Расіі каля 1 млн дадатковых смерцяў пераважна мужчын у працаздольным узросце. Справа ў тым, што 1 працоўнае месца ў самалётабудаванні завязана з 10-15 працоўнымі месцамі ў іншых галінах перапрацоўчай прамысловасці. Усе гэтыя працоўныя месцы з'яўляюцца высокакваліфікаванымі і ўяўляюць сабой крыніцу даходаў, здольную забяспечыць існаванне сем'яў занятых на іх работнікаў. Адпаведна, разбурэнне гэтых працоўных месцаў прыводзіць да хуткай маргіналізацыі велізарных слаёў насельніцтва, якую не могуць спыніць ніякія сацыяльныя выплаты.

Прыведзены прыклад паказвае, што паспяховая сацыяльная палітыка не магчыма без эфектыўнай эканомікі. І гэта цалкам заканамерна, бо аддзяленне эканомікі ад сацыяльнай сферы з'яўляецца ўбогай спадчынай савецкага «галінавізму» і прымітыўнага фундаменталісцка-рынкавага разумення грамадства.

**Аддзяленне эканомікі ад сацыяльнай сферы з'яўляецца ўбогай спадчынай савецкага «галінавізму» і прымітыўнага фундаменталісцка-рынкавага разумення грамадства.**

Калі мы гаворым пра канкрэтную эканоміку адной дзяржавы ў свеце, то эфектыўнай з'яўляецца такая эканоміка, якая забяспечвае ўзнаўленне і развіццё грамадства, а таксама стабільнае становішча дзяржавы ў сусветнай палітычнай сістэме і сістэме падзелу працы.

Такім чынам, галоўная крыніца эфектыўнасці сацыяльнай палітыкі — гэта эфектыўная эканоміка, эканоміка развіцця. Пры дэградацыі эканомікі ніякая сацыяльная палітыка не здольна спыніць сацыяльную дэградацыю. З іншага боку, вытанчаная і паспяховая сацыяльная палітыка праз правільную матывацыю насельніцтва (гэта значыць, «працоўнай сілы») можа стаць фактарам эканамічнага ўздыму і грамадскага развіцця. Менавіта такі сцэнар мы павінны рэалізаваць у Беларусі, калі хочам бачыць нашу краіну паспяховай і моцнай.

Улічваючы няпростае міжнароднае і эканамічнае становішча Беларусі, варта прызнаць, што прайсці гэты шлях без мер жорсткай эканоміі будзе немагчыма. Аднак недапушчальна ўзводзіць памяншэнне выдаткаў сацыяльнай сферы ў ранг галоўнай задачы сацыяльнай палітыкі. Не таму, што такі падыход амаральны (хоць і гэта — немалаважны аргумент). А таму, што ён неэфектыўны і згубны для краіны.

Таму формулай, ідэалогіяй эканамічнай мадэрнізацыі ў Беларусі неабходна зрабіць лозунг «Эфектыўнасць у імя справядлівасці». Сацыяльная справядлівасць застаецца найважнейшай асноватворнай каштоўнасцю для беларускай дзяржавы. А для таго, каб дамагчыся рэалізацыі гэтай каштоўнасці, патрэбна выверaная, тэхналагічная і ў вышэйшай ступені эфектыўная работа палітыкаў, кіраўнікоў і простых грамадзян, накіраваная на стварэнне новага грамадскага багацця.

**Юрый ЦАРЫК,**
**кіраўнік Беларускай групы развіцця** ■

НАВІНЫ ПАДЗЕІ ФАКТЫ

### ДЛЯ ПАДВОЗУ ЎДЗЕЛЬНІКАЎ І ГАСЦЕЙ «МІНСКАЙ ЛЫЖНІ» АРГАНІЗУЮЦЬ ДАДАТКОВЫ ТРАНСПАРТ

**Для забеспячэння транспартнага абслугоўвання ўдзельнікаў і гледачоў традыцыйнага зімовага спартыўнага свята «Мінская лыжня — 2013» дадаткова арганізуюць работу аўтобуснага маршруту № 1С «Палац спорту — ДС Вяснянка» і тралейбуснага маршруту № 10Д «ДС Вяснянка — ст.м. Пушкінская». Аб гэтым БЕЛТА паведамілі ў дзяржаўнай установе «Сталічны транспарт і сувязь».**

Мерапрыемства адбудзецца на гарадской лыжаролернай трасе 2 сакавіка, аўтобусы № 1С і тралейбусы № 10Д будуць хадзіць з 8:30 да 18:00. Акрамя названых маршрутаў ахвотныя могуць дабрацца да месца правядзення свята (прыпыначнага пункта «Футбольны манеж») аўтобуснымі маршрутамі №№ 1, 11, 44, 73, 91, 130, 136; тралейбуснымі маршрутамі №№ 10, 28; экспрэсны аўтобуснымі маршрутамі № 1019-тк, 1051-тк, 1055-тк, 1056-тк, 1073-тк, 1086-тк, 1089-тк, 1097-тк, 1109-тк, 1233-тк, 1507-тк.

### МАХЛЯР ЗАРАБІЎ МІЛЬЯРД НА ТЭКСТЫЛІ

**Супрацоўнікі праваахоўных органаў прадухілілі дзейнасць злачыннай групы, члены якой мелі намер здзейсніць крадзеж маёмасці аднаго з адкрытых акцыянерных таварыстваў Віцебска на суму 795 мільёнаў рублёў шляхам махлярства, заключыўшы дагавор пастаўкі тэкстыльнай прадукцыі з адтэрміноўкай плацяжу.**

Як паведамілі ў прэс-службе Упраўлення ўнутраных спраў Віцебскага аблвыканкама, міліцыянерамі, якія займаюцца барацьбой з арганізаванай злачыннасцю і карупцыяй, было ўстаноўлена, што загрузка і крадзеж тавараў планаваліся сёлета з 15 па 18 лютага.

— Асаблівасцю гэтага віду махлярства з'яўляецца тое, што кантакты махляра з прадпрыемствамі ажыццяўляліся з дапамогай сродкаў сотавай сувязі і электроннай пошты, зарэгістраваных на староннніх, у тым ліку выдуманых асоб, што выключала яго далейшае візуальнае апазнанне і ўстанаўленне асобы, — падкрэслілі ва УУС Віцебскага аблвыканкама. — Перад правядзеннем крадзяжоў камбінатар старанна вывучаў звесткі з інтэрнэт-крыніц аб гаспадарчай дзейнасці прадпрыемства. Перамовы адбываліся з выкарыстаннем рэквізітаў рэальна існуючых прадпрыемстваў як на тэрыторыі Рэспублікі Беларусь, так і на тэрыторыі Расіі, для чаго махляр вырабіў падробленыя дакументы і пячаткі.

Арганізатар махлярскай схемы арыштаваны і знаходзіцца ў следчым ізалятары. Ёсць звесткі аб дачыненні згаданай асобы да здзяйснення на працягу года шэрагу крадзяжоў шляхам махлярства не менш чым на 3 прадпрыемствах тэкстыльнай прамысловасці розных абласцей рэспублікі. Сваімі дзеяннямі ён нанёс агульную шкоду ў памеры больш як 1 мільярд рублёў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ
ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ
27 лютага 2013 г.
№ 4 (302)

# Сустрэчы на месцах — гэта карысна

Ілона ІВАНОВА

**Наш карэспандэнт пагутарыў са старшынёй Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу па эканоміцы, бюджэце і фінансах Уладзімірам Панцюховым пра сенатарскую працу, сустрэчы з людзьмі, фінансы і эканамічныя перспектывы.**



### Што людзей хвалюе

**— Вас абралі сенатарам ад Магілёўскай вобласці, і цяпер вы — старшыня Пастаяннай камісіі. Як вы сябе адчуваеце на новай працы?**

— Хачу пачаць размову з цытаты Прэзідэнта. Вось я сабе запісаў: «Сенатары павінны ісці ад жыцця, ад практыкі і адказаць на пытанне: прыняце той ці іншы закон рэальную карысць людзям і краіне?» Гэта для мяне ўстаноўка. Мне яшчэ трэба вучыцца, вучыцца і вучыцца. Таму я, як старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі, імкнуся «па максімуме» бываць у працоўных калектывах, у раёнах, на пасяджэннях выканкамаў і сесіях Саветаў дэпутатаў, праводжу прыёмы грамадзян. З гэтага я пачаў — «адштурхнуўся» ад жыцця і практыкі.

**— Апошнія дні на мінулым тыдні вы правялі ў Магілёўскай вобласці. Што вы тут рабілі?**

— У Краснаполлі браў удзел у пасяджэнні райвыканкама, дзе я выступіў па двух пытаннях — пра скарачэнне дакументаабароту і выкананне Дырэктывы № 3, асабліва актуальнай у Год беражлівасці. Пасля заканчэння правёў прыём па асабістых пытаннях.

**— Пра што пыталіся ў вас людзі з глыбінкі?**

— Дарогі, калодзежы, грошы — розныя канкрэтныя праблемы. Напрыклад, патрабуецца дапамога хлопчыку, які атрымаў сур'ёзную траўму, — яму трэба рабіць складаную аперацыю. Ёсць і больш глабальныя пытанні: у прыватнасці, аптымізацыя дзяржаўнага кіравання ад верху да нізу. Людзей хвалюе, што гэта азначае? Ці будзе ўзбуйнены Краснапольскі раён? А што будзе з сельсаветамі? Вядома, што з прычыны эканоміі прапануецца некаторую колькасць сельсаветаў ліквідаваць, а яшчэ ўвесці пасады, дзе будзе сумяшчацца праца па двух кірунках — выканаўчай улады і прадстаўнічай.

**— Вы таксама бралі ўдзел у сесіі Шклоўскага раённага Савета дэпутатаў?**

— Там слухалі справаздачы райвыканкама і прэзідыума раённага Савета. Я размаўляў з людзьмі, і зноў узніклі пытанні пра аптымізацыю. Дарэчы, у Шклоўскім раёне ўжо зрабілі крок да аптымізацыі: узбуйнілі сельсаветы. Але, калі праўду казаць, ужо шкадуюць аб гэтым, бо з'явіліся цяжкасці. Цяпер пра далейшае скарачэнне і слухаць не хочуць. У ідэале аграгарадок павінен быць цэнтрам сельсаветапрадпрыемства і сельсавет: у гэтым кірунку і павінна ісці абмеркаванне.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ТЭМА ТЫДНЯ

# КНЯГІНІНЦЫ НЕ ЗДАЮЦЦА

## І просяць мясцовыя ўлады пакінуць ім сельскі Савет

Надзея ДРЫЛА

**Той, хто чытае нашу газету ад першай да апошняй старонкі, памятае крык аб дапамозе жыхароў аграгарадка Княгінін, звязаны з закрыццём беларускамоўнай школы. Чарговы ліст з подпісамі больш чым 200 вяскоўцаў, які мы атрымалі сёлета, тычыцца не школы (хоць гэтая праблема па-ранейшаму актуальная), а ліквідацыі ў аграгарадку Княгінін сельскага Савета... Варта сказаць, што падобныя скаргі прыйшлі на адрас газеты і з іншых рэгіёнаў Мінскай вобласці...**

### «Просім-молім: не чапайце!»

*Вытрымкі з ліста жыхароў Княгініна:*

«Мы шакіраваны гэтай навіной і лічым гэта рашэнне непрадуманым, паспешлівым. Яно наносіць шкоду нашым людзям. Княгінін — самы вялікі аграгарадок Мядзельскага раёна. Тут шырока развітая інфраструктура, пражывае каля тысячы жыхароў. На тэрыторыі Княгініна размяшчаюцца вельмі важныя для раёна прадпрыемствы: адзіная ў раёне буйная чыгуначная станцыя, газанапаўняльная станцыя, якая абслугоўвае некалькі раёнаў, аддзяленне Мядзельскай ЖКГ, аддзяленне Вілейскага камбікормавага завода, аддзяленне Мядзельскага паліваазбыту, асфальтны завод... У Княгініне знаходзіцца Свята-Троіцкая царква XIX стагоддзя, 7 крам.

Жыхары Княгініна і вёсак, якія знаходзяцца паблізу (а там пражываюць у асноўным пенсіянеры), вымушаны пастаянна звяртацца ў сельскі Савет для рашэння тых ці іншых неадкладных жыццёва важных праблем. Цяжка ўявіць сабе, як дабрацца 80-гадоваму чалавеку з вёсак Воткул, Лёткі, Мацясы ў Сваткі — а менавіта туды хочуць перанесці наш Савет. Нам, простым людзям, здаецца, што гэта супярэчыць палітыцы Прэзідэнта, якая накіравана на тое, каб клапаціцца пра людзей, ствараць спрыяльныя ўмовы для іх пражывання ў сельскай мясцовасці».



Жыхары Княгініна: «Мы шакіраваны гэтай навіной...»

...Падыходжу да будынка Княгінінскага сельвыканкама, які месціцца якраз насупраць царквы. На дзвярах аб'ява аб тым, што а 14-й гадзіне адбудзецца сустрэча з карэспандэнтам, г.зн. — са мной. Да прызначанага часу ў кабінет старшыні сельскага Савета падцягваюцца людзі, пераважна сталага веку. Эмоцыі ў княгінінцаў б'юць цераз край, абурэнне, змешанае з адчаем, адчуваецца ў словах кожнага.

«У нас у Княгініне некалі былі і бальніца, і аптэка, і пякарня, і пілорама, і кузня, і камбінат бытавога абслугоўвання. Усё знішчылі... На працягу амаль 10 гадоў чыноўнікі імкнуцца зачыніць школу ў аграгарадку. Цяпер вось за сельсавет узяліся... Паволна нас выжываюць. Што гэта за адраджэнне вёскі?».

«Не разумею, чаму менавіта Княгінінскі сельсавет ліквідуецца? Раней за гонар было тут застацца жыць. А калі закрыць у нас сельсавет, хто ж сюды паедзе? Куды б вы паехалі жыць у 25 гадоў: туды дзе ёсць школа, сельскі Савет, аптэка, клуб? Ці ў глухую вёску — туды, дзе нічога няма?»

«Закрываюць сельскі Савет... А хто думае пра пенсіянераў, ветэранаў? Цяпер усе пытанні на месцы вырашаюцца. Адным махам, як гаворыцца. А як чалавек пенсійнага ўзросту зможа дабрацца па тую самую даведку ў Сваткі? Хто-небудзь падумаў? Цэлы дзень толькі на дарогу страціш...».

«Трэба, каб раённае начальства ўдумліва падышло да гэтага пытання, каб параўнала Княгінін і Сваткі, адкуль усе едуць да нас на кірмаш, у царкву, яблыкі ды ягады здаваць у нарыхтоўчую краму. Я разумею, што ў Сватках таксама людзі, такія ж, як і мы. Але ж іх менш. Што ж цяпер — большасць падпарадкоўваецца меншасці?»

«Княгінін крыкам крычыць, просім-молім, не чапайце гэты сельсавет. Але ж быццам глухія ўсе, не чуюць. Што нам рабіць?..»

— А вы на чыім баку ў гэтай няпростай сітуацыі? — звяртаюся да старшыні Княгінінскага сельскага Савета Часлава АДАМОВІЧА.

— За апошнія 8 гадоў у Княгінінскім сельсавеце колькасць насельніцтва зменшылася на 600 чалавек — стала 1834. Гэта працэс натуральны. Таму хочам мы ці не, але рана ці позна ўзбуйненне адбудзецца, ад гэтага мы нікуды не падзенемся. Якім чынам, гэта ўжо не ад мяне залежыць. Зразумела, што я, як жыхар Княгініна, хацеў бы, каб цэнтр сельсавета быў у Княгініне. Сваткаўскі старшыня, пэўна, за тое, каб цэнтр быў у Сватках...

### «Мы таксама пісаць умеем»

Сустрэча з жыхарамі Сваткаўскага сельсавета прайшла больш спакойна. І зразумела чаму тут людзі не абураюцца, бо пакуль што мясцовыя ўлады «на іх баку». Там не менш, ніхто з прысутных не выказаў вялікага жадання да аб'яднання.



Алег БАРОЎКА, старшыня Мядзельскага раённага Савета дэпутатаў.

«Кажуць, што ўсё для людзей робіцца. Дык каму ж пасля гэтага аб'яднання будзе лягчэй жыць? Княгінінцы трапяць у нявыгаднае становішча, вядома. Мы разумеем іх. Калі б трэба было перанесці цэнтр у Княгінін, то і мы б абураліся. І пісалі б. Вы не думайце, мы таксама пісаць умеем».

— Можа, варта, год-два пачакаць з гэтым аб'яднаннем, не бударажыць вясковых людзей, не ствараць ім лішніх праблем, — кажа старшыня адкрытага акцыянернага таварыства «Сваткі» Мікалай ВАРАБЕЙ. — Паспрабаваць неяк раённым уладам на ўзроўні вобласці ўзняць гэтае пытанне.

— Я таксама прытрымліваюся меркавання, што добра было б нашы сельсаветы пакінуць у цяперашнім выглядзе — і адзін, і другі, — дадае старшыня Сваткаўскага сельскага Савета Вера ХАЦЯНОВІЧ. — Не настолькі мы маленькія, каб нас так хутка аб'яднаць. Калі ўсё ж такі будзе дадзена такая каманда, то па ўсіх параметрах цэнтрам павінны быць Сваткі. Гэта будзе зручней для большасці людзей. З Княгініна праз Сваткі ў Мядзел можна даехаць на грамадскім транспарце без праблем. Жыхарам жа майго сельсавета, калі цэнтр будзе не ў Сватках, трэба ехаць па даведку ў Княгінін, вяртацца назад у Сваткі і ехаць у Мядзел. Нават з гэтага пункту погляду нязручна, бо нават за дзень можна не справіцца.

(Заканчэнне на 2-й стар. «МС».)

ПЕРСПЕКТЫВЫ

# Смалявічы выходзяць на «арбіту»

## Якім будзе спадарожнік Мінска

**Падрыхтоўка адпаведных службаў да будаўніцтва горада-спадарожніка Мінска разгледжана на пасяджэнні Смалявіцкага райвыканкама. Пытанне, дарэчы, вельмі актуальнае, паколькі горад мяркуецца развіваць хуткімі тэмпамі. Ужо сёння неабходна актыўна ўзводзіць камунікацыі, сацыяльныя, культурныя аб'екты, каб дастойна сустрэць навасёлаў, якія прыедуць са сваімі сем'ямі. Бясспрэчна, ім трэба даць не толькі работу, але і стварыць камфортнае і годнае жыццё: забяспечыць дзіцячымі садкамі, школамі, гандлёвымі і бытавымі цэнтрамі, медыцынскімі і культурнымі ўстановамі. Словам, прадаставіць умовы — не горшыя, а нават лепшыя, чым у сталіцы.**

Сёння Смалявічы — буйны эканамічны і прамысловы цэнтр Мінскай вобласці. Менавіта на яго развіццё ўплывае выгаднае геаграфічнае становішча: тут праходзіць чыгунка, міжнародная аўтамагістраль, непадалёку знаходзіцца аэрапорт «Мінск-2». У раёне размешчаны 10 буйных прадпрыемстваў, а спрыяльны дзелавы клімат прыцягвае сюды бізнэсменаў і прадпрымальнікаў, замежныя актывы. Як адзначыў старшыня райвыканкама Міхаіл Загорцаў, шэраг сталічных камерцыйных структур выказалі жаданне перанесці ў Смалявічы свой бізнэс. Сёння ў рэальным сектары эканомікі ёсць 1000 вакантных рабочых месцаў, якія трэба запоўніць. «Мы пралічылі, што да канца года іх з'явіцца больш за 2000», — адзначыў Міхаіл Загорцаў. Так што можна з упэўненасцю сцвярджаць: без працы мінчане не застануцца».

> **Шэраг сталічных камерцыйных структур выказалі жаданне перанесці ў Смалявічы свой бізнэс.**

Па ацэнках экспертаў, на працягу трох гадоў Смалявічы ўвойдуць у дзясятку паспяховых прамысловых раёнаў Беларусі. Тут робяць стаўку на інавацыйныя тэхналогіі ў машынабудаванні, металаапрацоўцы і электратэхніцы. Асноўныя галіны вытворчасці атрымаюць новы віток развіцця ў абноўленым тэхнапарку. Да вытворчых плошчаў, якія існуюць, будуць прыбудаваны новыя — Мінскі абласны тэхнапарк стане галоўнай інавацыйнай базай вобласці. Частку плошчаў у будучыні плануецца здаваць у арэнду пад высокатэхналагічныя вытворчасці. Буйной пляцоўкай для іх размяшчэння стане Кітайска-беларускі індустрыяльны парк. Больш за 8 тыс. гектараў у раёне аэрапорта мяркуецца аддаць пад вытворчыя базы, лабараторыі, цэнтры распрацовак, інфраструктуру. А заснавальнікі і рэзідэнты будуць мець выгадныя ўмовы падаткаабкладання і стартавыя прывілеі. Тэрыторыя парка будзе насіць статус асаблівай эканамічнай зоны.

Будаўніцтва парка і горада-спадарожніка павінна прыцягнуць у Смалявічы кваліфікаваныя кадры. План інвестыцыйнага развіцця ўключае ў сябе забудову жылых кварталаў, інфраструктуры, аб'ектаў сацыяльнага карыстання, з'явяцца і новыя транспартныя развязкі, якія злучаць Смалявічы са сталіцай.

Як адзначыў намеснік міністра будаўніцтва і архітэктуры Дзмітрый Семянкевіч, падыходы да стварэння гарадоў-спадарожнікаў на працягу трох-чатырох гадоў мяняліся. Напрыклад, спачатку планавалася размяшчаць тут, так бы мовіць, спальныя раёны. Але затым стала зразумела, што Мінск сутыкнецца з вялікім патокам транспарту і «пробкамі». Сусветная практыка паказвае, што гарады-спадарожнікі павінны ўключаць не толькі жылыя кварталы, але і рабочыя месцы, новыя вытворчасці. І дзейнічаць тут трэба метадам перніка: ствараць прыцягальныя ўмовы і для вытворцаў, і для насельніцтва. На думку архітэктараў, вышыня дамоў у горадзе-спадарожніку не павінна перавышаць 3—5 паверхаў. На першых паверхах будуць абсталяваны месцы для паркоўкі аўтатранспарту. Запланавана і будаўніцтва гандлёвых і культурна-забаўляльных цэнтраў, офісаў, магазінаў, гасцініц, кавярняў і рэстаранаў. Разам з тым, распрацаваны праект рэканструкцыі ўсяго горада. Новая і старая часткі будуць уяўляць сабой як бы адно архітэктурнае цэлае, адзіны ансамбль, аб'яднаны агульнымі вуліцамі і дарогамі, цэнтрам. Варта дадаць, што ад гэтага выйграюць не толькі навасёлы, але і карэнныя жыхары, якія атрымаюць магчымасць карыстацца ўсімі выгодамі цывілізацыі.

Разглядаецца і пытанне аб транспартных зносінах паміж Мінскам і Смалявічамі. Ёсць нават задума пусціць хуткасную электрычку, расшырыць аўтатрасу Слабада — Навасады да чатырох палос. Генпланам прадугледжана рэканструкцыя чыгуначнага вакзала, будаўніцтва тут падземнага пераходу, пашырэнне праезджых частак вуліц у старым горадзе і будаўніцтва новых магістраляў.

У самога праекта ёсць як прыхільнікі, так і крытыкі. На думку старшыні райвыканкама, праз 2-3 гады, калі ў горадзе адбудуцца значныя перамены, песімістычныя настроі знікнуць. Сёння падрыхтаваны генеральны план, праектна-каштарысная дакументацыя на інжынерныя сеткі, вядзецца будаўніцтва першага дзевяціпавярховіка на 142 кватэры. У трэцім квартале мяркуецца закладка яшчэ аднаго жылога дома. У гэтых збудаваннях на дахах будуць устаноўлены газавыя кацельні. Бясспрэчна, каб забяспечыць нармальную жыццядзейнасць населенага пункта, які значна вырасце ў памерах, плануецца ўзвядзенне пажарных дэпо, артэзіянскіх свідравін, падземных водазабораў, якія дазволяць забяспечыць людзей якаснай пітной вадой. Адпаведныя змены чакаюць і сістэмы гарадской каналізацыі, газазабеспячэння.

> **Ужо вядома, што пэўную частку дамоў разбураць на вуліцах Савецкай, Жодзінскай, Сацыялістычнай, у мікрараёне Паўднёвы Захад.**

Пры будаўніцтве горада-спадарожніка не пазбегнуць і ўшчыльнення жыллёвага фонду. Гэта пацягне за сабой пэўны знос старога жылля. Перш чым яго запланаваць, пытанне дэталёва вывучалася, а людзей рыхтавалі маральна: яны атрымаюць новыя добраўпарадкаваныя кватэры. Ужо вядома, што пэўную частку дамоў разбураць на вуліцах Савецкай, Жодзінскай, Сацыялістычнай, у мікрараёне Паўднёвы Захад. Апошні выбраны невыпадкова. Менавіта сюды будзе прыбываць хуткасная электрычка з Мінска. Таму будаўніцтва там жылля эканамічна апраўдана і выгадна. Варта дадаць, што ўзводзіць новы горад, можна сказаць, уся краіна. Сюды ідуць сродкі рэспубліканскага, абласнога, раённага бюджэтаў, прадпрыемстваў і арганізацый.

Нагадаем, што згодна з пастановай Савета Міністраў Беларусі № 976, (2010 г.) рэалізацыя праграмы будаўніцтва буйных жылых раёнаў для мінчан у гарадах-спадарожніках і вынас прадпрыемстваў за межы сталіцы будзе адбывацца ў два этапы. Сёння ў райцэнтры пражывае каля 19 тыс. чалавек, а з канчатковым уводам у дзеянне горада-спадарожніка колькасць насельніцтва павялічыцца да 63 тысяч.

**Таццяна ЛАЗОЎСКАЯ.**

# НЕ Ў КРЫЎДЗЕ. АЛЕ Ў ЦЕСНАЦЕ

## У вёсцы Хаціслаў Маларыцкага раёна адчуваецца дэфіцыт месцаў у дзіцячую дашкольную ўстанову



Сярэдняя група з выхавальніцай Любоўю СМАЛЬ.

**У раёнах новых забудоў вялікіх гарадоў даўно ўзніклі праблемы з месцамі ў дзіцячыя садкі. Жылля будуецца шмат, засяляюць яго пераважна маладыя сем'і, у іх нараджаюцца дзеці. Гараджане ў такіх выпадках нярэдка вымушаны вазіць малых у іншыя мікрараёны горада. Цяпер актыўна загаварылі пра міні-садкі, іншыя формы нагляду і выхавання дзяцей паблізу ад дома. А што ж у вёсцы? Там, як правіла, месцаў для дашкольнікаў хапае. Але...**

Хацiслаўскі сельсавет — адна з самых паўднёвых тэрытарыяльных адзінак не толькі Брэстчыны, але і ўсёй краіны. Тут размешчаны два афіцыйныя пункты пропуску ва Украіну: адзін — міжнародны чыгуначны, другі — спрошчаны, аўтамабільны. Апошнім часам Хацiслаў стаў вядомы як месца буйнейшых залежаў прамысловых пяскоў і мелу. Тут ужо працуюць першыя прадпрыемствы аб'яднання «Кварцмелпрам», іншыя ствараюцца. З часам за 3—5 кіламетраў ад вёскі вырасце буйны прамысловы цэнтр.

Мясцовыя жыхары працуюць у СВК, лясніцтве, аб'ектах сацыяльна-культурнага прызначэння аграгарадка. Ужо з дзясятак гадоў у сельсавеце адзначаюць станоўчую дэмаграфію: нараджаецца грамадзян больш, чым памірае. Вось і летась нарадзілася 37 немаўлят, натуральны прырост насельніцтва склаў за год 9 чалавек. Нават суседзі здзіўляюцца. Магчыма, падмурак цяперашняга дэмаграфічнага росту закладзены былой знакамітай гаспадаркай «Запаветы Леніна», якую 48 гадоў узначальваў вядомы аграрый Леанід Лявонаў. Тут будавалася шмат жылля, моладзь масава не з'язджала ў горад.

Тады, у сярэдзіне 1970-х, і ўзвялі ў вёсцы двухпавярховы дзіцячы сад па тыпавым праекце. Па тым часе будынак быў з самых лепшых. Для ведамаснай дзіцячай дашкольнай установы былы калгасны старшыня не шкадаваў сродкаў. Сюды набывалі добрую мэблю і інвентар, тут своечасова рамантавалі і падтрымлівалі парадак. Дагэтуль вакол садка стаіць «тая» агароджа. Загадчыца дашкольнай установы Любоў Саўчук адзначае, што базай, закладзенай ў 1970-я, садок карыстаецца і зараз. Праўда, дзіцячая ўстанова даўно не на балансе сельгаспрадпрыемства — яе перадалі раённаму аддзелу адукацыі. У апошнія гады за кошт раённага бюджэту тут праведзены рамонт фасада будынка і харчовага блока, заменены вокны.

У дзіцячых групах (у чым давялося пераканацца на свае вочы) ёсць усё неабходнае для паспяховага выхаваўчага працэсу. У садку працуюць музычны работнік, харэограф і лагапед. Функцыянуюць нават платныя гурткі, таму ёсць магчымасць своечасова і ў дастатку набываць гаспадарчыя і канцылярскія тавары, мыйныя сродкі. З дзецьмі працуюць вопытныя педагогі.

Не хапае толькі... месцаў для дзяцей.

— Установа разлічана на 75 выхаванцаў, — расказвае Любоў Саўчук, — зараз іх у нас 85.

Любоў Навумаўна ўсю «вясковую статыстыку» трымае пад рукой. Садок наведваюць дзеці з Хацiслава, Мельнікаў, Сушытніцы. На тэрыторыі сельсавета зараз пражываюць 144 дзіцяці дашкольнага ўзросту. Вось і летась нарадзіліся 34. Гэта значыць, патрэба ў месцах будзе толькі расці.

Днямі да загадчыцы заходзілі дзве маладыя мамы: яны хацелі б ужо цяпер аддаць дзяцей у садок. Ім адказалі, што заявы могуць быць задаволены толькі з верасня, а сёння такой магчымасці няма фізічна. Садок перапоўнены. Нават для заняткаў лагапеда месца адводзіцца ў спальным пакоі адной з груп. А для іншых заняткаў часта даводзіцца ссоўваць мэблю — вызваляць такім чынам прастору. Садку цесна. Наспела неабходнасць яго пашырэння.

— Мы не раз паднімалі гэтае пытанне ў раёне, — гаворыць старшыня Хацiслаўскага сельскага Савета Уладзімір Смаль. — Там праблему ведаюць, а ў гэтым годзе ў нас добрая навіна: плануецца падрыхтаваць праектна-каштарысную дакументацыю на прыбудову да садка.

Гэта проста неабходнасць для вёскі! З суседніх населеных пунктаў арганізаваны падвоз дзяцей. Па меры росту прадпрыемстваў «Кварцмелпраму» будзе расці і колькасць занятых там, і праблема з месцамі для дашкольнікаў можа паглыбіцца.

— Мы разлічвалі, што прамысловае прадпрыемства нечым дапаможа ў вырашэнні сацыяльных пытанняў вёскі, — кажа Уладзімір Смаль. — Але пакуль яны працуюць нерэнтабельна, нават дарогу, якую абяцалі пракласці ў абход населенага пункта, не зрабілі. Відаць, трэба чакаць, пакуль аб'яднанне трывала стане на ногі. У нас існуе добрая традыцыя — дапамагаць садку грамадой. Лясніцтва нядаўна падарыла «казачныя домікі», час ад часу дапамогу аказвае мясцовы СВК.

Як паведаміла карэспандэнту «МС» начальнік Маларыцкага раённага аддзела адукацыі Таццяна Лаўрэенка, літаральна праз тыдзень-другі будуць падрыхтаваны неабходныя дакументы і вызначана ўстанова, якая зоймецца падрыхтоўкай праекта на дабудову дзіцячага садка ў Хацiславе. У новым памяшканні змогуць размясціцца дзве групы. Праектна-каштарысная дакументацыя будзе гатова сёлета, і тады на наступны год стане магчымым уключэнне аб'екта ў абласны план фінансавання будаўнічых работ.

У Брэсцкай вобласці сёння працуе 349 дзіцячых дашкольных устаноў. Каля 75% вясковых дзяцей наведваюць дзіцячыя сады. Вядучы спецыяліст гэтага ўпраўлення Наталля Шамовіч адзначыла, што ў апошнія гады не толькі ў горадзе, але і ў сельскай мясцовасці практыкуюцца групы часовага знаходжання, калі дзеці праводзяць некалькі гадзін у дашкольнай установе. У вёсках можа падаўжацца час работы садка на перыяд актыўных сельгасработ. Недахоп месцаў у сельскіх садках — з'ява рэдкая. Звычайна малых бяруць у дашкольную ўстанову, калі можна паставіць дадатковы ложак у спальні ці шафку ў раздзявалцы. Іншая справа, калі месца проста няма фізічна.

Наталля Шамовіч засяродзіла ўвагу яшчэ на адной праблеме, якая спрыяе дэфіцыту месцаў. Гэта... недастатковая свядомасць бацькоў. Праблема аднолькава актуальна як для горада, так і для вёскі. Бывае, бацькі бяруць накіраванне, афармляюць дзіця ў садок, а яно не наведвае ўстанову альбо наведвае раз-два ў месяц. Мама знаходзіцца ў дэкрэтным водпуску ці ў сям'і ёсць бабуля, таму малы толькі займае месца, але не ходзіць, а ўзяць на гэтае месца іншае дзіця работнікі садка не маюць права.

**Святлана ЯСКЕВІЧ.**

*Маларыцкі раён.*

# СУСТРЭЧЫ НА МЕСЦАХ — ГЭТА КАРЫСНА

## З кабінетаў — у калектывы

**— У чым вы бачыце прызначэнне сенатара?**

— Калі казаць высокім стылем, то сенатары — гэта аддзел «тэхнічнага кантролю», які на канчатковым этапе ацэньвае ўсе напрацоўкі, зробленыя міністэрствамі і ведамствамі. Але ў маім разуменні, гэтая праца прынцыпова не адрозніваецца ад дзейнасці дэпутата парламента. Сенатар — гэта чалавек, які ажыццяўляе сувязь паміж насельніцтвам і ўладай, а сустрэчы з людзьмі — гэта «падсілкоўванне» на месцы. Яны неабходныя, каб зразумець, што сёння сапраўды хвалюе народ, як задаволіць яго патрэбы: выкарыстоўваць стары закон альбо выпрацаваць новы. Як зрабіць, каб пытанні не хвалявалі людзей, а сталі ім зразумелымі.

**— А камусьці падаецца, што ваша праца — пасяджэнні і нарады ў кабінетах.**

— Сенатары — не кабінетныя людзі. Большасць з іх мае асноўнае месца працы, за якую атрымліваюць заробак, а паралельна працуюць у Пастаянных камісіях у Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу. За выключэннем вызваленых 7 чалавек: Старшыні Савета Рэспублікі, яго намесніка і старшынь пяці Пастаянных камісій, якія працуюць на прафесійнай аснове. Аднак нават у гэтых «кабінетных» людзей адбываюцца пастаянныя сустрэчы на месцах.

**— Эканоміка, бюджэт і фінансы... Пастаянная камісія, якую вы ўзначальваеце, займаецца найбольш складанымі пытаннямі. Ці хапае ведаў?**

— Камісія няпростая. Я меў да ўсяго гэтага дачыненне, але цяпер трэба вывучаць нарматыўную базу, бываць у Нацыянальным банку, Міністэрстве эканомікі і іншых установах. Мы будзем прымаць закон пра каштоўныя металы і камяні, таму нядаўна пабывалі ў Дзяржаўным сховішчы каштоўнасцяў. Я меркаваў, што гэта будзе моцнае ўражанне. Але калі бачыш усё гэта багацце дзяржавы, зліткі серабра і золата, якія важаць кілаграмы, уражанне проста ашаламляльнае.

## За фінансы спакойны

**— Кажуць, што насамрэч людзей хвалююць тры тэмы — надвор'е, здароўе і грошы. Якраз да апошняга вы цяпер маеце непасрэднае дачыненне. Ці ёсць падставы для хваляванняў?**

— Падчас свайго знаходжання ў Нацыянальным банку ў выступленні некаторых банкіраў чуў пэўную занепакоенасць: як забяспечыць крэдытнымі рэсурсамі вырашэнне задач, якія стаяць перад урадам? Але Надзея Андрэеўна Ермакова мякка, але ўпэўнена дала зразумець, што ніякіх падстаў для хваляванняў няма ні ў насельніцтва, ні ў банкаў. Усё забяспечваецца, і стабільна.

І ўсе гэтыя «ўкідванні» ў інтэрнэт пра валюту, — проста спробы расхістаць сітуацыю.

**— Жыццё кожнага чалавека залежыць ад стану эканомікі, і ў любым пытанні можна знайсці эканамічны падмурак. Што сёння, на ваш погляд, самае актуальнае ў эканамічных працэсах, якія адбываюцца ў нашай краіне?**

— Мне хацелася б, каб мы не кідаліся з крайнасці ў крайнасць. Каб абралі кірунак і ішлі па ім абдумана і падрыхтавана.

Так, сёння ўсе ўзяліся за мадэрнізацыю, але не факт, што атрымаецца ўсё, ва ўсіх і адразу. Ці хопіць сіл? Спадзявацца, што дзяржава падкладзе саломы крэдытамі і рэсурсамі, — дарма. Зразумела, калі Пётр Пятровіч Пракаповіч гаворыць, што без мадэрнізацыі мы безнадзейна адстанем ад усіх развітых краін. Мадэрнізацыя патрэбна. Але, разам з тым, трэба дакладна ўсведамляць, што мы можам, дзе і калі.

Трэба таксама прыцягнуць да працэсаў мадэрнізацыі фінансавыя магчымасці недзяржаўнага сектара, каб узаемна ўвязаць развіццё дзяржаўнага і прыватнага сектараў эканомікі. Таму і рыхтуецца прадпрымальніцкі савет на ўзроўні рэспублікі.

## Не думаць, «як усе»

**— Ці падабаецца вам увогуле ваша новая праца? Не сумуеце па роднай Магілёўшчыне?**

— Я сабе такога пытання не задаваў. Ну, пэўная настальгія, вядома, ёсць, бо ўсё маё жыццё прайшло ў Магілёўскай вобласці. Але ёсць і адказнасць перад краінай. Я проста абавязаны бываць у чатырох сельскіх раёнах Магілёўскай вобласці — Касцюковіцкім, Чавускім, Чэрыкаўскім і Краснапольскім, якія вылучылі мяне сенатарам. Аднак на тыдні я буду ў Гомельскай вобласці, потым у Віцебску. А затым паеду ў Гродзенскую і Брэсцкую вобласці, каб параўнаць. Многія гавораць, што ў «заходнікаў» іншы менталітэт, і я хачу яго зразумець.

**— Якія мэты вы ставіце перад сабой? Чаго чакаеце ад сенатарства?**

— Чакаю, каб і тыя, хто побач са мной, адчулі, што мне не дарэмна даверылі прадстаўляць людзей і рэгіён у галоўным заканадаўчым органе краіны. Я спадзяюся, што не падвяду, буду імкнуцца зрабіць усё, каб давер апраўдаць.

Калі ты думаеш, «як усе», то памыляешся, бо ўсе маюць розныя меркаванні. Калі ты думаеш «за ўсіх» — то зноў памыляешся, бо ў кожнага свае клопаты. Трэба думаць па-свойму, але не забывацца пра іншых.

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

# КНЯГІНІНЦЫ НЕ ЗДАЮЦЦА

(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар. «МС».)

— Ад будынка Сваткаўскага сельскага Савета да нашай вёскі Узла 15 км, — кажа дэпутат па Узлянскай выбарчай крузе Алена РУСАК. — Ва Узле жыве больш за паўтары сотні чалавек. Не можам пахваліцца, што гэта маладыя сем'і, якія вырашаюць свае пытанні на ўласных машынах. Сярод жыхароў пераважна пажылыя людзі, якім мы дапамагаем даехаць да аграгарадка Сваткі, бо рэйсавы транспарт да нас не заязджае. Просім старшыню мясцовай гаспадаркі, каб падвозілі іх разам з рабочымі на калгасным аўтобусе. Калі будзе ў Княгініне цэнтр сельсавета, што тады рабіць? Вельмі перажываю за людзей.

## Не маленькія, але і не вялікія!

Алег БАРОЎКА, старшыня Мядзельскага раённага Савета дэпутатаў, бачыць цэнтрам аб'яднанага сельсавета Сваткі.

**— Аргументуйце, калі ласка, сваё бачанне.**

— Аграгарадок Сваткі геаграфічна размешчаны ў цэнтры аб'яднанай тэрыторыі. У зону радыусам 10 км з цэнтрам сельсавета ў аграгарадку Сваткі трапляе абсалютная большасць населеных пунктаў Сваткаўскага і палова Княгінінскага сельсаветаў. У той жа час аграгарадок Княгінін размешчаны на мяжы раёна і ў 10-кіламетровую зону з цэнтрам у аграгарадку Княгінін трапляе толькі палова населеных пунктаў Княгінінскага сельсавета і... ніводнага населенага пункта Сваткаўскага сельсавета.

**— Як дабрацца 80-гадоваму чалавеку з аддаленай вёскі Княгінінскага сельсавета ў Сваткі, калі там усё ж такі будзе цэнтр?**

— А як дабрацца пажылому чалавеку з Узлы, калі зрабіць цэнтр у Княгініне? Зразумела, што нечыя інтарэсы парушацца. Але ж мы павінны думаць пра ўсіх, пра тое, каб захаваць інтарэсы большасці населеных пунктаў. Тым больш, рэгулярна ходзіць аўтобус па маршруце г.п. Крывічы — Княгінін — Сваткі — Мядзел. Пасля аб'яднання Княгінін не страціць статус аграгарадка. Больш за тое, мы плануем выдзеліць у памяшканні Княгінінскага сельвыканкама пакой для прыёму грамадзян, дзе па спецыяльным графіку мясцовым жыхарам будуць выдавацца дакументы і даведкі. Маючы 5 чалавек у штаце сельвыканкама (скарачаць дзяржслужачых у сельвыканкамах не збіраюцца), гэта можна рэальна арганізаваць. І яшчэ: вопыт паказвае, што ў сельскія Саветы цяпер людзі ў асноўным звяртаюцца па тэлефоне. Паверце, калі кіраўніку спраў сельсавета тэлефануе пенсіянер, які жыве ў аддаленай вёсцы і, напрыклад, па стане здароўя не можа сам забраць даведку (а яна можа спатрэбіцца ўсяго разы два на год), то яму заўсёды ідуць насустрач.



Жыхары аграгарадка Сваткі: «Можа, з аб'яднаннем варта пачакаць?»

**— Алег Алегавіч, усё ж такі як ні круці, а Сваткаўскі і Княгінінскі сельсаветы не такія і маленькія — і па колькасці жыхароў, і па плошчы. Чаму нельга іх пакінуць, не аб'ядноўваць?**

— У адпаведнасці з даручэннем Прэзідэнта, усім раёнам Мінскай вобласці дадзена ўказанне прапрацаваць пытанне аптымізацыі сельсаветаў. Пры гэтым, згодна з ацэнкай Акадэміі навук Беларусі, на тэрыторыі сельсавета павінна пражываць не менш за 2 тысячы чалавек. Напрыклад, Крывіцкі пассавет, у адрозненне ад Слабодскага, Старагабскага, Занарацкага, Сырмежскага, Княгінінскага ды Сваткаўскага сельсаветаў, адпавядае гэтаму патрабаванню, таму яго ніхто і не чапае...

**Фота аўтара.**

*Мядзельскі раён.*

### А ў гэты час у Маладзечанскім раёне...

...Мясцовыя ўлады гарой стаяць за Маркаўскі сельсавет, на тэрыторыі якога пражывае 1155 чалавек. Нават ліст на адрас старшыні Мінаблвыканкама напісалі — з просьбай разгледзець пытанне аб захаванні гэтага сельсавета.

**Фёдар ДАМАЦЕНКА, старшыня Маладзечанскага райвыканкама:**

*— Да аб'яднання сельсаветаў трэба падыходзіць індывідуальна. Ёсць такія, якія трэба аб'ядноўваць, і мы не бачым у гэтым цяжкасцяў. Але часам, аб'ядноўваючы два сельсаветы, мы можам стварыць яшчэ больш праблем! Пажылым людзям складана будзе звярнуцца са сваімі праблемамі да мясцовай улады. Гэта звязана, у першую чаргу, з вялікім транспартным «плячом». Акрамя таго, ліквідацыя Маркаўскага сельсавета можа прывесці да адтоку кадраў, што адмоўна адаб'ецца на развіцці аграгарадка Маркава. Мы прааналізавалі сітуацыю, напісалі ліст-абгрунтаванне і чакаем адказ. Думаю, што рашэнне прымуць правільнае і рацыянальнае, з улікам нашага меркавання.*

**Былы старшыня Княгінінскага сельскага Савета Уладзімір ШУМАН:**

*— Пасля аб'яднання можа разарвацца шчыльная сувязь мясцовай улады з насельніцтвам. Прыёмны дзень раз ці два на месяц гэтую сувязь не замяніць. Нельга яе разрываць. Трэба, каб нехта пастаянна быў на месцы і вёў работу з людзьмі.*

**Святлана ГЕРАСІМОВІЧ, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні:**

*— Аптымізацыю сельскіх Саветаў мы праводзілі, праводзім і будзем праводзіць, бо яе неабходнасць дыктуе само жыццё. Але да любых перамен трэба падыходзіць разумна, узважана, абдумана, з улікам меркавання мясцовага насельніцтва, у тым ліку дэпутатаў, старастаў. Пры прыняцці канчатковага рашэння на месцах павінны кіравацца ў першую чаргу законам. Бо кожнаму хочацца, каб будынак сельскага Савета быў за 2 метры ад яго дома. Але, пагадзіцеся, старым людзям і за 2 км цяжка ісці ў сельсавет, і за 20. Да пенсіянераў як ездзілі, так і будуць ездзіць. Ды і транспартныя шляхі зносін сёння зусім іншыя, і тэлефонная сувязь. Таму перш чым узбуйняць тэрыторыю сельсаветаў, трэба дэталёва і ў комплексе прадумаць, якім чынам будзе наладжана сувязь з мясцовым насельніцтвам у новым, больш маштабным па тэрыторыі сельсавеце.*

# ЖЫЛЛЁ — КОЖНАМУ ЎЧАСТКОВАМУ

**Паводле слоў начальніка Упраўлення ўнутраных спраў аблвыканкама Ігара Яўсеева, у віцебскай глыбінцы цяпер не стаіць пытанне недахопу ўчастковых інспектараў: не хапае аднаго-двух, і тое не ў кожным аддзеле міліцыі.**

Амаль што ўсе раённыя аддзелы ўкамплектаваны. Дарэчы, у Прыдзвінскім краі адзін з самых нізкіх недакамплектаў участковых, ніжэй толькі ў Брэсцкай вобласці.

Кіраўніцтва УУС занепакоена ў першую чаргу станам спраў у абласным цэнтры, у прыватнасці, у яго Першамайскім і Кастрычніцкім раённых аддзелах. Гэтая праблема на кантролі кіраўніцтва УУС і губернатара. У прыватнасці, старшыня Віцебскага аблвыканкама Аляксандр Косінец даў указанне, каб сёлета ўсе ўчастковыя былі забяспечаны службовым жыллём.

У сувязі з рэфармаваннем структуры МУС ёсць прапанова зрабіць участковых начальнікамі адміністрацыйных участкаў. У выніку павысіцца і планка прысваення званняў — да падпалкоўніка. Кіраўнікі УУС разлічваюць, што гэтыя змены паспрыяюць павышэнню прэстыжу работы ўчастковых інспектараў.

Каб вырашыць праблему з недахопам кадраў у самім абласным цэнтры, ствараецца будаўнічы кааператыў, у якім вялікая доля кватэр будзе прызначацца для ўчастковых. Такі падыход у Мінску паспрыяў павелічэнню колькасці ахвотных несці службу на пасадзе ўчастковага.

Праблема недахопу машын для ўчастковых вырашаецца ў тым ліку і пры дапамозе дэпартамента «Ахова»: перадаюцца машыны, якія раней эксплуатаваліся. У цэлым на Віцебшчыне папаўняецца парк аўтамабіляў для розных міліцэйскіх службаў. Віцебскі аблвыканкам выдзеліў 14 адзінак транспарту. Губернатар падпісаў дакумент аб выдзяленні больш як 1,5 млрд. руб. на пакупку чарговай партыі машын. Гаспадаркі Віцебшчыны набылі для міліцыянераў шэсць новых аўто.

Вельмі актыўна папаўняецца парк міліцэйскіх аўтамабіляў, дзякуючы ў тым ліку і асабістай падтрымцы старшыняў райвыканкамаў.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ.**

СЕСІЯ

# НАМЕРЫ І ДЗЕЯННІ

## На чарговай сесіі Магілёўскага абласнога Савета дэпутаты абмеркавалі, як летась вырашаліся пытанні жыццезабеспячэння насельніцтва

**Са справаздачай перад дэпутатамі выступіў старшыня Магілёўскага аблвыканкама Пётр Руднік — ён засяродзіў увагу не столькі на задзеле, які быў зроблены летась, колькі на захадах па безумоўным выкананні прагнозных паказчыкаў сёлета.**

Кіраўнік вобласці сказаў пра праблемы. Адна з іх — запасы гатовай прадукцыі на складах прадпрыемстваў, што прыводзіць да дэфіцыту абаротных сродкаў. (На 1 студзеня 2013 года запасы ацэньваліся больш чым у 2 трыльёны рублёў). Зразумела, што трэба павышаць канкурэнтаздольнасць прадукцыі — па цане і якасці. А для гэтага неабходна комплексная мадэрнізацыя вытворчасцяў.

Старшыня аблвыканкама нагадаў пра тры «і» — інвестыцыі, інавацыі, ініцыятыву, да якіх дадаецца і імпартазамяшчэнне. А таксама ўспомніў пра Год беражлівасці, эканомію энергіі і рэсурсаў, выхаванне гаспадарлівасці ў людзей на працоўных месцах і ў паўсядзённым жыцці.

Паколькі вынікі працы прамысловасці ў студзені нельга назваць суцяшальнымі, наганяць даводзіцца ў лютым і сакавіку. Улада заклікае кіраўнікоў прадпрыемстваў максімальна загрузіць магутнасці і павялічыць эфектыўнасць вытворчасці, каб забяспечыць людзям большыя заробкі.

Заробак лічаць самым галоўным паказчыкам якасці жыцця людзей. Летась у снежні ў Магілёўскай вобласці сярэдні заробак дасягнуў дакрызіснага ўзроўню і жаданых 500 долараў. Сёлета сярэдні заробак, паводле прагнозаў, абазначаны ў 600 долараў, але павелічэнне заработнай платы павінна быць звязана з павышэннем прадукцыйнасці працы.

Толькі тры арганізацыі ў рэгіёне плацяць сваім работнікам сярэдні заробак ніжэй за 300 долараў у эквіваленце, і там павінны адбыцца перамены.

❒❒❒

**Намеснік старшыні абласнога Савета дэпутатаў Раіса ЛЫЧКОЎСКАЯ** расказала, як укараняецца аўтаматызаваная інфармацыйная сістэма «Мясцовыя Саветы дэпутатаў». Увогуле Раіса Лычкоўская адзначыла працу пярвічнага ўзроўню: там працуюць толькі два чалавекі — старшыня і кіраўнік спраў, аднак ім удаецца вырашаць значную колькасць розных жыццёвых пытанняў.

Увогуле дэпутаты, якія выходзілі падчас сесіі на трыбуну, ставілі на парадак дня самыя розныя пытанні. Напрыклад, многіх турбуе ўпарадкаванне закінутых безгаспадарных сядзіб і зямельных надзелаў — часам цяжка весці перамовы з нядбайнымі спадчыннікамі сельскай уласнасці... Магілёў мае патрэбу ў рамонце гарадской бальніцы хуткай дапамогі, а Бабруйск — у развіцці тралейбуснай сеткі як найбольш экалагічнага віду гарадскога транспарту.

**Памочнік Прэзідэнта, галоўны інспектар па Магілёўскай вобласці Генадзь ЛАЎРАНКОЎ** заклікаў усіх прысутных адкрыта казаць пра негатыўныя тэндэнцыі — дзеля іх выпраўлення. І настойліва папрасіў мясцовых кіраўнікоў не наракаць на «аб'ектыўныя цяжкасці», а адказваць за сваю працу. Прагнозныя паказчыкі — напружаныя, але рэальныя, іх можна і трэба выконваць, прагучала з трыбуны падчас сесіі абласнога Савета.

❒❒❒

На сесіі падвялі вынікі штогадовага **спаборніцтва сярод органаў мясцовага самакіравання ў Магілёўскай вобласці.** Гэта спаборніцтва праводзіцца з 2006 года ў некалькіх намінацыях, і прызамі з'яўляюцца значныя грашовыя прэміі — ад 30 да 500 базавых велічынь.

**Лепшым за 2012 год стаў Кароўчынскі сельсавет Дрыбінскага раёна.** Яго старшыні Уладзіміру Даніленку на пасяджэнні ўручаны пераходны сцяг і дыплом 1 ступені. Сельсавет атрымае прэмію ў 500 базавых велічынь. Другое і трэцяе месца, адпаведна, занялі **Княжыцкі сельсавет Магілёўскага раёна і Стайкаўскі сельсавет Кіраўскага раёна.**

Першае месца ў спаборніцтве сярод органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання заняў **сельскі камітэт аграградка Цяцерына Круглянскага раёна,** які ўзначальвае Алег Цішкоў. Грашовая прэмія пераможцу — 50 базавых велічынь. Другое месца заняў староста аграгарадка Дуброва Быхаўскага раёна Васіль Кіпець, а трэцяе — Ала Татур, староста вёскі Свіханава Асіповіцкага раёна.

Сярод гарадскіх органаў тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання лепш за ўсіх папрацаваў летась **дамавы камітэт ЖЭУ № 6 Ленінскага раёна Магілёва** пад старшынствам Яўгеніі Чамярычкі. Другую і трэцюю пазіцыю ў намінацыі занялі цэнтр тэрытарыяльнага грамадскага самакіравання № 2 Ленінскага раёна горада Бабруйска і дамавы камітэт — вуліца Калініна, 5 горада Чэрыкава.

**Ілона ІВАНОВА.**

СІТУАЦЫЯ

# ДАХ ПРАЦЯКАЕ, «КАНТОРА» ПІША

**Камітэт дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці практыкуе выезды ў раёны такім чынам, каб у адзін дзень правесці прыёмы грамадзян практычна ва ўсіх цэнтральных населеных пунктах, а таксама наведаць аб'екты эканомікі і сацыяльнай сферы. У мясцовых жыхароў ёсць магчымасць выказацца па ўсіх пытаннях. А кантралёрам — даведацца аб праблемах, характэрных не толькі для канкрэтнай тэрыторыі, але і для вобласці ці нават усёй краіны.**

Зразумела, не ўсё можна вырашыць адразу. Па некаторых пытаннях, узнятых у Шчучынскім раёне, адразу ж атрымалі даручэнні кіраўнікі адпаведных раённых структур. Але ж магчымасці бюджэту не бязмежныя — з чымсьці давядзецца пачакаць.

Хоць, здараецца, што надзённая для людзей праблема не вырашаецца зусім не з прычыны аб'ектыўных цяжкасцяў.

Цікавая сітуацыя склалася ў двухкватэрным доме па вуліцы Працоўнай у г.п. Астрына. У адной з кватэр на першым паверсе з 1986 года пражывае сям'я Дзежыц. А вось кватэра на другім паверсе пустуе. І не месяц, два, а ажно з кастрычніка 2010 года: кватэранаймальнік быццам з'ехаў у Расію.

Якім жа чынам на жыльцах з першага паверха адбіваецца працяглая адсутнасць суседзяў?

Мар'ян Дзежыц запрашае пераканацца ў гэтым на свае вочы — паказвае сапсаваныя шпалеры ў пакоях, трэснутую плітку на кухні. Гэта таму, што ў доме працякае дах, і праз пустуючую кватэру, дзе доўгі час няма ацяплення (кажуць, што нават кацёл адтуль украдзены) вільгаць бесперашкодна пранікае ўніз. З вельмі сур'ёзнымі непрыемнасцямі для жыльцоў з першага паверха.

Зразумела, яны забілі трывогу. Не мірыцца ж з пастаяннай сырасцю ў кватэры, жудасным станам шпалер і затратамі на іх замену. Аднак больш за два гады з боку ўласніка жылля — сельгаспрадпрыемства «АграГЖБ» не назіралася ні жадання вызначыцца з далейшым лёсам пустуючай кватэры, ні канкрэтнай працы па стварэнні нармальных жыллёвых умоў для сям'і Дзежыц (амаль 30 гадоў у доме не было капітальнага рамонту).

Не ўбачыўшы дзеянняў з боку ўласніка жылля, людзі звярнуліся ў райвыканкам і ў ліпені мінулага года атрымалі адказ, які падпісаў першы намеснік старшыні, начальнік упраўлення сельскай гаспадаркі і харчавання Сяргей Матуйза. Іх абнадзеілі, што спецыялістамі сельгаспрадпрыемства «АграГЖБ» дом абследаваны і прынята рашэнне адрамантаваць дах за кошт сродкаў гэтага прадпрыемства. На жаль, жыллёвыя праблемы Мар'яна Іванавіча, яго жонкі і дзіцяці, якое яны ўзялі пад апеку, не вырашыліся. У пачатку лістапада ім зноў, практычна слова ў слова і за тым жа подпісам, паабяцалі рамонт даху. Аднак спрыяльныя для гэтых работ умовы надвор'я былі ўжо ўпушчаны.

— Прыехалі, скінулі ў агарод стары рубероід, але з-за ападкаў пакрыць дах новым не паспелі. Стала нават горш, чым было: снег падае, растае, і вада цячэ ў хату. Як жыць? — абураецца Мар'ян Дзежыц.

— Як бачым, праблема «з барадой», — пракаментаваў сітуацыю намеснік старшыні Камітэта дзяржаўнага кантролю Гродзенскай вобласці Анатоль Дарожка. — І не таму, што яна звышскладаная і патрэбны вялізныя фінансавыя затраты, а з-за бяздзейнасці шэрагу службовых асоб. Сям'я Дзежыц не патрабуе для сябе нічога лішняга, ніякіх прывілей, а толькі тое, што ўласнік жылога будынка (у нашым выпадку — прадпрыемства «АграГЖБ») зрабіць абавязаны. Паводле заканадаўства, уласнікі жылля павінны своечасова праводзіць яго капітальны і бягучы рамонт, на што пасля ўмяшання Камітэта дзяржкантролю і было ўказана кіраўніцтву сельгаспрадпрыемства. Аднак выкананне далёка не самага складанага рамонту (трэба пакласці на даху дома максімум дзесяць рулонаў рубероіду і прыняць меры па нармальным цеплазабеспячэнні) падмяняецца, па сутнасці, толькі абяцанкамі. Жыллёвыя ўмовы сям'і Дзежыц з-за незавершанага рамонту пагоршыліся. Інакш як халатным, мякка кажучы, стаўленнем да выканання сваіх службовых абавязкаў, здзекам з людзей гэта не назавеш. Больш за тое, два гады ўласніка жылля не хвалюе, што адна з кватэр пустуе і ніхто за яе не плаціць! І толькі пасля таго, як людзі прыйшлі да мяне на прыём, і пракуратуры, райвыканкаму было даручана заняцца гэтай справай, уласнік дома нарэшце звярнуўся ў суд, каб аб'явіць у вышук кватэранаймальніка. Так, яго пошук на неабсяжных прасторах Расійскай Федэрацыі можа зацягнуцца. Але ёсць жа нарматыўная база, якая дазваляе мясцовым органам улады па ініцыятыве ўласніка жылля зрабіць вопіс маёмасці ў пустуючай кватэры (што там можа знаходзіцца, калі нават ацяпляльны кацёл укралі?), пакласці яе на захоўванне і распачаць рамонт. Чаму гэта ўласнікам не робіцца? І гэта ў той час, калі стаіць задача па максімуме ўцягнуць у абарот памяшканні, якія не выкастоўваюцца. А тут — больш за два гады пустуе кватэра ў цэнтры гарпасёлка, дзе каля 70 сем'яў стаяць у чарзе на атрыманне жылля.



Фота Алы БІБІКАВАЙ.

Той самы дом па вуліцы Працоўнай у г.п. Астрына.

> «Больш за два гады пустуе кватэра ў цэнтры гарпасёлка, дзе каля 70 сем'яў стаяць у чарзе на атрыманне жылля.

Напрыклад, у Астрынскай гарпасялковай бальніцы, дзе мы пабывалі разам з Анатолем Дарожкам, другі год працуе педыятрам малады спецыяліст, выпускніца Гродзенскага дзяржаўнага медыцынскага ўніверсітэта, якая плаціць 25 долараў за здымную кватэру. Хаця пры размеркаванні, кажа, ёй было абяцана жыллё. Старшыня Астрынскага пасялковага Савета дэпутатаў Мікалай Каранкевіч паведаміў, што ёсць намер у будынку былога інтэрната абсталяваць некалькі кватэр, у тым ліку і для бальніцы. Аднак адпаведны рамонт толькі плануецца, а малады доктар, які абслугоўвае шмат дзяцей, пасля заканчэння тэрміну абавязковай адпрацоўкі заставацца ў пасёлку не збіраецца. Па розных прычынах, у тым ліку, верагодна, і з-за жыллёвага пытання.

**Барыс ПРАКОПЧЫК.**

*Шчучынскі раён.*

МЯСЦОВАЕ САМАКІРАВАННЕ — ГАЗЕТА ДЛЯ ВЫБАРШЧЫКАЎ І ДЭПУТАТАЎ МЯСЦОВЫХ САВЕТАЎ

РЭГІСТРАЦЫЙНАЕ ПАСВЕДЧАННЕ № 15 ад 17 лютага 2009 года выдадзена Міністэрствам інфармацыі Рэспублікі Беларусь.

**Заснавальнікі:** Савет Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Палата прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь, Рэдакцыя газеты «Звязда»

**Галоўны рэдактар КАРЛЮКЕВІЧ Аляксандр Мікалаевіч.**

**Адказная за выпуск КАРПЕНКА Н.У.**

Грамадскі савет: **ГЕРАСІМОВІЧ С.М.**, старшыня Пастаяннай камісіі Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь па рэгіянальнай палітыцы і мясцовым самакіраванні; **СЦЕПАНЕНКА А.М.**, адказны сакратар Савета па ўзаемадзеянні органаў мясцовага самакіравання пры Савеце Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь; **АЦЯСАЎ А.Я.**, старшыня Віцебскага абласнога Савета дэпутатаў; **НАВУМЕНКА А.В.**, старшыня Нараўлянскага раённага Савета дэпутатаў; **СУШЧАНКА М.Л.**, старшыня Глушанскага пасялковага Савета дэпутатаў Бабруйскага раёна.

**АДРАС РЭДАКЦЫІ:** 220013, г. Мінск, вул. Б. Хмяльніцкага, 10-а.

**КАНТАКТНЫ ТЭЛЕФОН:** 292 44 12;

**e-mail:** info@zvyazda.minsk.by

**Газета аддрукавана ў Рэспубліканскім унітарным прадпрыемстве «Выдавецтва «Беларускі Дом друку». ЛД № 02330/0494179 ад 03.04.2009. 220013, Мінск, пр. Незалежнасці, 79.**

**Тыраж 25.227. Нумар падпісаны ў 19.30 26 лютага 2013 года.**

# У НЯСВІЖСКАГА РАЁНА ЁСЦЬ НЕ ТОЛЬКІ МІНУЛАЕ І СУЧАСНАСЦЬ, АЛЕ І БУДУЧЫНЯ




(Заканчэнне. Пачатак на 1-й стар.)

Наш раён адметны таксама вытворчасцю цукровых буракоў. Пазалетась мы атрымалі 550 цэнтнераў з гектара — гэта вельмі высокі ўраджай, і мы лічылі, што трэба зрабіць усё, каб замацаваць такі вынік. Але ў мінулым годзе мы дасягнулі яшчэ больш высокай ураджайнасці гэтай культуры — сапраўдны рэкорд для раёна. І адбылося гэта дзякуючы таму, што мы выкарыстоўваем навуковыя падыходы да яе вырошчвання. Гэта высокарэнтабельная культура, таму мы будзем рабіць стаўку на яе. Да 2015 года стаіць задача павялічыць плошчы пад цукровыя буракі да 6200 га. Таму не памылюся, калі скажу, што гэтая культура зараз фарміруе эканоміку раслінаводства ў гаспадарцы.

**У мінулым годзе актыўна ішоў працэс стварэння і ўдасканалення работы прыватных прадпрыемстваў. Усяго ў раёне зарэгістравана 966 індывідуальных прадпрымальнікаў (у тым ліку 196 — у 2012 годзе) і 225 прадпрыемстваў недзяржаўнай формы ўласнасці. Грашовыя паступленні ад іх дзейнасці склалі 25,6% ад агульнай сумы паступленняў.**

**— А як ідуць справы ў жывёлагадоўлі, удзельная вага прадукцыі якой, калі не памыляемся, складае каля 70% ад усёй прадукцыі сельскай гаспадаркі ў раёне?**

— Павінен сказаць, што нашы жывёлаводы папрацавалі летась на славу: удой на адну фуражную карову склаў 6929 кг — гэта лепшы паказчык у вобласці і рэспубліцы. І ў гэтай «намінацыі» зноў наперадзе снаўчане: па гаспадарцы ў іх надоена ад каровы па 8878 кг малака, а на малочнатаварным комплексе «Сычы» — па 10315 кг.

Сярэднясутачныя прыбаўленні ў вазе буйной рагатай жывёлы ў мінулым годзе склалі 726 г, а ў лепшым па гэтым паказчыку СВК «Гарадзея» — 847 г. Сярэднясутачныя прыбаўленні ў вазе свіней у сярэднім па раёне дасягнулі 605 г, у агракамбінаце «Сноў» гэты паказчык склаў 675 г.

У цэлым жа ў раёне па выніках мінулага года вытворчасць малака на 1 б/га склала 45 кг пры нарматыве 25 кг, а вытворчасць жывёлы і птушкі таксама на 1 б/га вырасла да адзнакі ў 14,9 кг пры нарматыве 8 кг.

**— Якім чынам дасягаюцца такія вынікі?**

— Высокіх вынікаў у жывёлагадоўлі можна дасягнуць, абапіраючыся на тры складнікі: добры запас кармоў высокай якасці, кадры і рэканструкцыя ўжо існуючых і будаўніцтва новых жывёлагадоўчых памяшканняў.

Мы сфарміравалі ўстойлівую базу для жывёлагадоўлі. Сёння ў гаспадарках раёна — паўтара-двухгадовы запас кармоў. Гэта дае магчымасць захоўваць стабільнасць. Другая задача — паляпшэнне якасці кармоў. Гэта адзін з рэзерваў года, які наступіў.

Што тычыцца кадраў, хачу сказаць, што ў апошні час штогод у раён на працу прыходзяць каля 200 маладых спецыялістаў. І вельмі прыемна тое, што больш за 70% іх застаецца працаваць у раёне, «пускае тут свае карані». Мы стараемся павышаць іх кваліфікацыю на базе сваіх перадавых прадпрыемстваў. Для маладых спецыялістаў, кіраўнікоў гэта важна. Вывучаем спецыялістаў, фарміруем кадравы рэзерв — у перспектыўнай моладзі ёсць усе магчымасці для кар'ернага росту. Немалаважным фактарам з'яўляецца наяўнасць жылля, і мы гэта ўлічваем. Вось і ў гэтым годзе пачнём будаваць 48 дамоў у раёне для маладых сем'яў.

Таксама ў мінулым годзе былі ўведзены ў строй 3 новыя малочнатаварныя фермы — «Жанковічы» (ААТ «Новае жыццё»), «Вялікая Лысіца» ў СВК «Гарадзея» і «Друцкаўшчызна» ў СВК «Агракамбінат Сноў». На 14 малочнатаварных фермах у мінулым годзе вяліся буйнамаштабныя работы па іх мадэрнізацыі і рэканструкцыі. Да пачатку 2013 года ўсе запланаваныя работы былі завершаны, усе аб'екты ўжо здадзены ў эксплуатацыю.

У раёне функцыянуюць тры МТФ з рабатызаваным даеннем: МТФ «Макашы» ААТ «Нясвіжскія Астраўкі» і два кароўнікі МТФ «Вялікая Лысіца» СВК «Гарадзея».

Праца ў гэтым кірунку працягваецца і сёння. Перад раёнам стаяць амбіцыйныя задачы па рэканструкцыі: увесці ў строй дзве новыя малочнатаварныя фермы і пачаць будаўніцтва 6 ферм з тэрмінам уводу ў 2014 годзе. Плануем таксама ў гэтым годзе пачаць рэканструкцыю 5 ферм з тэрмінам уводу ў 2014 годзе.

Упэўнены, што ўсё, што мы сёння робім у жывёлагадоўлі, з'явіцца добрым зачынам у далейшым развіцці галіны і дасць магчымасць умацаваць яе лідзіруючыя пазіцыі.

**— У мінулым годзе Нясвіж насіў тытул «Культурная сталіца 2012 года»...**

Мінулы год быў выдатным у любым сэнсе гэтага слова. Так, у ліпені пасля васьмігадовай рэстаўрацыі быў адкрыты палацава-замкавы комплекс. Гэтай падзеі чакалі, напэўна, не толькі жыхары нашага раёна, але і ўся рэспубліка. Урачыстае адкрыццё адбывалася пры ўдзеле Прэзідэнта нашай краіны Аляксандра Рыгоравіча Лукашэнкі, які пакінуў запіс у кнізе ганаровых гасцей. Дзяржава ўклала ў рэстаўрацыю нашага замка па самых сціплых падліках 70 млн долараў. Варта адзначыць, што аўтарскі калектыў у складзе намесніка генеральнага дырэктара ААТ «Белрэстаўрацыя» Сяргея Друшчыца і кіраўнікоў групы архітэктараў Святланы Краюшкінай і Ірыны Палуда за рэстаўрацыю замка быў удастоены спецыяльнай прэміі Прэзідэнта нашай краіны «За духоўнае адраджэнне».

Што тычыцца статусу культурнай сталіцы Беларусі, які меў наш Нясвіж у мінулым годзе, то, на маю думку, тытул можа перадавацца іншым гарадам, але ў душы гэтае званне для нашага горада застанецца актуальным і далей. Вельмі многія культурныя мерапрыемствы не проста былі праведзены і забыты, але сталі традыцыйнымі. Як, напрыклад, Рэспубліканскі фестываль старадаўняй і камернай музыкі «Музы Нясвіжа», вечары Вялікага тэатра оперы і балета ў замку Радзівілаў, якія з кожным годам набіраюць размах.


Фотаздымкі Марыны БЕГУНКОВАЙ.

Яшчэ 2 гады таму мы распаўсюджвалі на іх квіткі. Але ўжо ў мінулым годзе ўсе білеты былі выкуплены. Больш за тое, мы прадалі яшчэ каля 300 квіткоў на дадатковыя месцы. А цяпер пачалі падключацца і іншыя тэатры, якія прывозяць сюды выдатныя спектаклі.

У мінулым годзе ў нашым замку ўпершыню з часоў Радзівілаў быў арганізаваны баль... Вельмі прыемна, што да культурных падзей, якія адбываюцца ў нас, сталі прыглядацца некаторыя нашы гарады-пабрацімы. Іх жыхары прыязджаюць да нас, менавіта падладжваючыся пад вечары оперы і балета Вялікага тэатра і іншыя мерапрыемствы. Так што вялікую цікавасць да горада і яго падзей праяўляюць не толькі ў рэспубліцы, але і за яе межамі.

**— А як рэагуе на гэтую цікавасць сфера паслуг?**

— Ідзе вялікае пашырэнне гэтай сферы. 2012 год даў, і, спадзяюся, 2013-ы дасць добры штуршок развіццю прыватнага бізнэсу. Мы падрыхтавалі шэраг інвестыцыйных пляцовак пад будаўніцтва гасцініц. Разлічваем, што ў гэтым годзе будуць пабудаваны дзве гасцініцы агульнай колькасцю на 250 месцаў. У мінулым годзе адкрылася тры кафэ-рэстараны і адна гасцініца ў замку.

**У мінулым годзе ў Нясвіжскім раёне было на траціну перавыканана заданне па ўводзе ў эксплуатацыю жылля — пры плане 10 тыс. кв. метраў будаўнічымі арганізацыямі было пабудавана і ўведзена ў эксплуатацыю 13 тыс. 341 кв. метр, у тым ліку 4 тыс. 473 кв. метры — у сельскай мясцовасці.**

**Колькасць турыстаў у Нясвіжы з кожным годам павялічваецца. У 2010 годзе горад наведалі 170 тысяч турыстаў, у 2011-м — 210 тысяч. У мінулым годзе ў Нясвіжы пабывала больш за 470 тысяч турыстаў з Беларусі, блізкага і далёкага замежжа. Плануецца, што ў 2013 годзе Нясвіжскі палац прыме не менш за паўмільёна наведвальнікаў.**

Мы вылучылі пляцоўкі, на якіх хутка павінны з'явіцца новыя кавярні і рэстараны. Тут мы чакаем актыўнасці з боку прыватнага бізнэсу. А гарадскія ўлады забяспечаць такую неабходную інфраструктуру, як дарожна-транспартныя сеткі, дарогі, стаянкі, зручныя грамадскія месцы. Гэта неабходна для камфорту турыстаў, развіцця сферы паслуг і для нармальнай жыццядзейнасці самога горада і яго жыхароў. Мы зараз працуем над такім праектам. У нашых планах — на тэрыторыі, прылеглай да паўднёвага боку горада, стварыць стаянкі, кемпінгі для турыстаў з аўтамабілямі.

Таксама з дапамогай вобласці і сумесна з інстытутам горадабудаўніцтва распрацоўваецца дэталёвы план рэгенерацыі гістарычнай забудовы Нясвіжа. Як вы ведаеце, палацава-паркавы комплекс, касцёл знаходзяцца ў зоне ЮНЕСКА, далей размешчана буферная зона — Стары горад, дзе абмежаваны вышынныя пабудовы і новае будаўніцтва... Дарэчы, ужо ў 2012 годзе было шмат зроблена па добраўпарадкаванні горада. Шмат сродкаў (каля 12 млрд руб.) пайшло на рэканструкцыю цэнтральнай вуліцы горада і прылеглых тэрыторый.

Мы з вамі з'яўляемся сведкамі таго, як у лепшы бок мяняюцца наш Нясвіж, сельскія населеныя пункты, аб'екты вытворчага і сацыяльнага прызначэння. Гэты працэс мы павінны працягваць з дня ў дзень, бо Нясвіж — гэта візітная картка, калі хочаце, брэнд усёй рэспублікі.

— Поспехаў вам і надалей!

**Святлана БУСЬКО.**

## БЕЛАРУСКІ ДЗІЦЯЧЫ ФОНД: 25 ГАДОЎ ВЯЛІКАЙ ДАБРАЧЫННАСЦІ

**Сотні дабрачынных мерапрыемстваў у падтрымку сацыяльна неабароненых катэгорый дзяцей — з такім здабыткам сустракае сваё 25-годдзе Рэспубліканскае грамадскае аб'яднанне «Беларускі дзіцячы фонд».**

Паводле слоў дырэктара БДФ Аляксандра ТРУХАНА, за апошнія 12 гадоў у межах праграмы «Цёплы дом» сумесна з мясцовымі органамі ўлады быў створаны 41 дзіцячы дом сямейнага тыпу (набыта для іх мэбля і бытавая тэхніка), а для 36 сем'яў — уладкаваныя катэджы. Дзякуючы гэтаму 609 дзяцей-сірот набылі дом і сапраўдную сям'ю! Толькі для рэалізацыі гэтага праекта ўдалося прыцягнуць звыш 1,4 млн долараў. У межах сумеснай з Міністэрствам аховы здароўя праграмы «Дзіцячае сэрца» ў Беларусь 21 раз прыязджала медыцынская брыгада кардыяспецыялістаў пад кіраўніцтвам доктара Вільяма Новіка. Разам з нашымі ўрачамі былі праведзены 443 складаныя аперацыі, 1800 дзяцей атрымалі кансультацыі. У дзіцячы кардыяхірургічны цэнтр перададзена вялікая колькасць гуманітарнай дапамогі, лекаў, абсталявання і расходных матэрыялаў.

Яшчэ ў 1991 годзе Дзіцячы фонд стаў ініцыятарам прыняцця Закона «Аб правах дзіцяці», у 2007-м — прадстаўнік фонду ўзяў удзел у пасяджэнні Генеральнай Асамблеі ААН па становішчы дзяцей. За вялікі ўклад у рашэнне пытанняў па абароне правоў і інтарэсаў дзяцей фонд узнагароджаны Ганаровай граматай Савета Міністраў Рэспублікі Беларусь.

Урачысты сход з нагоды 25-годдзя існавання арганізацыі адбудзецца сёння ў канцэртнай зале «Верхні горад». Гэта будзе сустрэча фонду з дзецьмі, якім ратавалі жыццё, якіх уладкавалі ў сям'ю, з людзьмі, што дапамагаюць дзецям.

**Святлана БАРЫСЕНКА.**

■ Здарэнні

## ПАЖАР НА ВІЦЕБСКАЙ ПЛОШЧЫ



У Віцебску адбыўся пажар у доме на Маскоўскім праспекце.

— Гэта здарылася а восьмай гадзіне вечара. Загарэлася 2-пакаёвая кватэра, размешчаная на 5 паверсе панэльнага дома. Асабовым складам падраздзяленняў МНС з кватэр, якія знаходзяцца на 6-м (і вышэй) паверсе, па лесвічным маршы эвакуіраваны 28 чалавек. Пажарнымі былі выратаваны гаспадар кватэры 1943 года нараджэння і яго жонка, — паведамілі ў Віцебскім абласным упраўленні па надзвычайных сітуацыях. — Абодва знаходзіліся ў пакоі ў непрытомнасці. Муж і жонка брыгадай «хуткай дапамогі» былі дастаўлены ў Віцебскую абласную клінічную бальніцу: жанчына з дыягназам «атручэнне прадуктамі гарэння» — у рэанімацыйнае аддзяленне, мужчына з дыягназам «апёкі верхніх дыхальных шляхоў» — у апёкавае.

Як мяркуецца, прычына пажару — неасцярожнасць пры курэнні.

**Аляксандр ПУКШАНСКІ**

■

**Считать недействительными страховые свидетельства по обязательному страхованию гражданской ответственности владельцев транспортных средств на территории РБ серии ВС №№ 0574384, 8977219 СООО «Белкоопстрах»** *УНП 100706519*

■ На свае вочы

# ТАЛІНСКІ МОСТ



**У Эстоніі пабывала беларуская дэлегацыя, у склад якой уваходзілі дэпутаты нацыянальнага парламента, бізнэсмены, вучоныя, актывісты грамадскага аб'яднання па сувязях з суайчыннікамі за мяжой «Радзіма», — першая такая прадстаўнічая за ўсе дваццаць постсавецкіх гадоў.**

800 кіламетраў займае шлях з Мінска ў Талін. Калісьці мы былі бліжэй. Не ў геаграфічным сэнсе. У адной краіне жылі. Сёння Эстонія — у НАТА, у шэнгенскай зоне, і яна паўнавартасны (а яшчэ кажуць, вельмі дысцыплінаваны) член Еўрасаюза, першая з постсавецкіх краін перайшла на еўра.

Менавіта тут прыдумалі скайп, паспяхова працуе сістэма электроннага ўрада. Вясной Эстонія плануе запусціць свой касмічны спадарожнік. Праўда, распрацавалі яго ды і выкарыстоўваць збіраюцца, не турбуючы гэтым дзяржаву, звычайныя студэнты Тартускага ўніверсітэта. Талін змагаецца за званне экалагічнай еўрапейскай сталіцы. І яшчэ ў Таліне вельмі прыгожы старажытны цэнтр, дзе хочацца проста гуляць і марыць. І мільёны замежных турыстаў у год для краіны з насельніцтвам пад мільён трыста тысяч — вельмі добры паказчык.

— Ідэя такой сустрэчы з'явілася недзе год таму, — расказвае Максім Дубянок, старшыня праўлення Грамадскага аб'яднання па сувязях з суайчыннікамі за мяжой «Радзіма». — Мы ведалі, што беларуская дыяспара ў Эстоніі вельмі актыўная. Узначальвае яе Ніна Савінава — вельмі энергічны чалавек. Менавіта яна і падрыхтавала гэтую сустрэчу, здольную пайсці на карысць абедзвюм нашым краінам.

Дарога да Таліна на аўтобусе праз Літву і Латвію займае каля 12 гадзін. На ўездзе нас сустракаюць эстонскія «беларусы». Старшыня Асацыяцыі беларусаў Эстоніі Ніна Савінава разам з мужам Сяргеем, не зважаючы на ўласныя справы, не выпускаюць нас з-пад сваёй увагі ўсе гэтыя дні.

### СУСТРЭЧА ПЕРШАЯ. «КРУГЛЫ СТОЛ»

Тут адразу пайшла гарачая размова пра перспектыву эканамічных стасункаў — як дзяржаўных, так і прыватнага бізнэсу. Да размовы падключыліся дэпутаты парламентаў Эстоніі і Латвіі — латвійскія парламентарыі спецыяльна прыехалі ў Талін на гэтую сустрэчу.

Многія мясцовыя бізнэсмены — ураджэнцы Беларусі, і да спраў на гістарычнай радзіме яны вельмі ўважліва ставяцца. Зацікаўлены і прадстаўнікі сур'ёзнага бізнэсу. Ігар Берман — член праўлення групы кампаній. Пачыналі сваю справу дваццаць гадоў таму з набыцця развалёнага суднарамонтнага цэха. Сёння там рамантуюць караблі ўжо для ўсёй Еўропы. Навучыліся і будаваць іх. Наладзілі вытворчасць цяжкіх металаканструкцый вагой звыш 200 тон. Іх кампанія пабудавала і самы буйны ў свеце паром на газавым паліве. Узводзіць ветраныя рухавікі на марскім шэльфе... І — яшчэ цэлы спіс высокатэхналагічных

**Калі мясцовыя фермеры ездзілі пратэставаць у Брусель супраць дыскрымінацыі ў справе сельскагаспадарчых датацый Еўрасаюза, то накіраваліся туды на старэнькім МТЗ. І 20-гадовы беларускі трактар не падвёў, спраўна пераадолеў шлях ад Таліна да Брусэля.**

кірункаў. Ад заказчыкаў адбою няма. Я пацікавіўся, за кошт чаго яны здзейснілі такі прарыў «Галоўнае — людзі, — коратка адказаў Ігар Берман. — Мы ніколі не шкадавалі ўкладанняў у чалавечы капітал. Нават у час крызісу 2008 года стараліся, каб нашы мазгавыя цэнтры ніякага крызісу не адчулі».

Беларусь цікавая эстонскаму бізнэсу. Толькі трэба ўлічваць рэаліі. Анекдоты пра марудлівасць мясцовых жыхароў — гэта казкі ўчарашняга дня. «Нам не патрэбны абяцанкі пра паслязаўтрашнія планы. Давайце рабіць тое, што можна цяпер. Калі не можаце, скажыце адразу. І мы не пакрыўдзімся, бо цяпер у свеце эканамічныя нішы запаўняюцца вельмі імкліва», — кажуць тут.

Эстонскія партнёры і ў час перамоў не выпускаюць з рук ноўтбукі альбо планшэтнікі — вядуць дзелавыя перамовы, сочаць за навінамі і тэндэнцыямі на сусветных і еўрапейскіх біржах. «Прыязджаў да нас сюды адзін з вашых важных сельскагаспадарчых кіраўнікоў, — кажа мне сусед за сталом. — Прапанаваў мільён бляшанак мясных кансерваў па два з паловай еўра за штуку. І меркаваў, што ласку робіць. «А калі гатовы адгрузіць?» — пытаюся. «Ну, недзе праз месяц. Наймай транспарт і забірай, мытны клопат твой». — «Мілы мой, — адказваю і дэманструю цэны на еўрапейскіх біржах. — Я табе нават паслязаўтра магу прывезці ў твой калгас эшалон аналагічнай тушонкі выдатнейшай якасці па 1 еўра 30 цэнтаў за бляшанку. І цана з дастаўкай».

Расказваюць і іншыя пра нестыкоўкі, што здараюцца пры спробах супрацоўнічаць з беларускімі прадпрыемствамі. Але на тое і сустрэліся, каб зразумець сітуацыю і шукаць канструктыўныя шляхі.

Старшыня Пастаяннай камісіі Палаты прадстаўнікоў па міжнародных справах Мікалай Самасейка расказвае, якія крокі плануе зрабіць наш парламент па актывізацыі дзелавой актыўнасці, якія законы прымаюцца да распрацоўкі. Ёсць спадзяванні і на выкарыстанне вопыту парламентарыяў прыбалтыйскіх краін — тут у справе прававой дапамогі бізнэсу і абароны інвестыцый прайшлі вялікі шлях.

— Яшчэ ў вас вельмі шмат пасрэднікаў, — заўважаюць гаспадары. Для прыкладу называюць адзін з флагманаў айчыннай прамысловасці, які ўпарта спрабуе працаваць на Прыбалтыку праз спецыяльна створанае агенцтва. А тое агенцтва адкрыла філіял у Латвіі, а рыжскі філіял, у сваю чаргу, — у Таліне. Гэтыя агенцтвы і філіялы філіялаў павышаюць цану і замаруджваюць час. У эстонцаў такой лагістыкі даўно няма, вострая канкурэнцыя вымушае прадпрыемствы працаваць напрамую.

**У 2004 годзе у Эстоніі пражывала 24 тысячы беларусаў. Сёння — каля 17 тысяч.**

Нягледзячы на ўсе цяжкасці, эканамічныя стасункі паміж Беларуссю і Эстоніяй добрыя. Зразумела, яны ўступаюць тавараабароту з суседкай Латвіяй, але ўзровень трымаюць. Як зазначыў Часовы Павераны ў справах Рэспублікі Беларусь у Эстонскай Рэспубліцы Вадзім Лазерка — у мінулым годзе Эстонія купіла больш за 200 беларускіх трактароў і 8 БелАЗаў, а годам раней — 350 МТЗ. Для маштабу Эстоніі — вельмі значныя лічбы. Калі мясцовыя фермеры ездзілі пратэставаць у Брусель супраць дыскрымінацыі ў справе сельскагаспадарчых датацый Еўрасаюза, то накіраваліся туды на старэнькім МТЗ. І 20-гадовы беларускі трактар не падвёў, спраўна пераадолеў шлях ад Таліна да Брусэля.

— Сустрэча ў такім фармаце— рэдкая з'ява. Але цікавая і, мяркую, карысная форма стасункаў бакоў, адзін з якіх у Мытным саюзе, а другі — член Еўрапейскага саюза, — зазначае кіраўнік Цэнтра вывучэння знешняй палітыкі і бяспекі Андрэй Русаковіч. — Патрабаванні часу вымушаюць імкліва шукаць новыя шляхі ўзаемадзеяння. І, як бачым, яны знаходзяцца.

— Эстонія для нас пакуль менш знаёмая, чым Латвія, — кажа намеснік старшыні Пастаяннай камісіі па эканамічнай палітыцы Нацыянальнага сходу Мікалай Калтуноў. — Але трэба і тут супрацоўнічаць больш актыўна. Нам патрэбна больш ініцыятывы. Бо, як кажуць у народзе, адчыняюць таму, хто стукаецца.

### ПАРЛАМЕНТ І МЭРЫЯ

Беларуская дэлегацыя наведала эстонскі парламент у дзень, калі там актыўна працавалі камісіі і фракцыі. Кінулася ў вочы вопратка дэпутатаў — вельмі дэмакратычная. Джынсы і світары — звычайная з'ява. Але пасяджэнні праходзяць па-дзеламу і даволі жорстка. Бо сутыкаюцца погляды канкуруючых партый, палітычных сапернікаў. Але да кансэнсусу вымушаны прыходзіць. Інакш выбаршчык не зразумее. Многія пасяджэнні праходзяць публічна. Яны могуць напрамую трансляваца ў інтэрнэце. Запіс захоўваецца ў электронных архівах, і яго лёгка заказаць сабе на дамашні камп'ютар. Па колькасці інтэрнэт-наведвальнікаў ацэньваюць і папулярнасць фракцыі ці эфектыўнасць працы камітэта. Дарэчы, пасяджэнні без папяровых дакументаў, а толькі з дапамогай электронных сродкаў і інтэрнэту ў Эстоніі праводзяцца ўжо з 2000 года.

Праз інтэрнэт у рэальным часе можна нават пахвілінна сачыць за станам дзяржаўнага бюджэту. А доступ да інтэрнэту ў Эстоніі нескладаны. Шмат дзе па краіне можна яго «лавіць» наогул бясплатна. Пабудавана недзе больш за тысячу пунктаў, якія транслююць бясплатны «Wifi». У 2007 годзе менавіта гэтая прыбалтыйская краіна першай у свеце прадаставіла грамадзянам на выбарах у парламент магчымасць галасаваць праз інтэрнэт. І хаця апазіцыйныя дэпутаты скардзіліся, што гэта дае ўладам магчымасць маніпуляваць галасамі, у 2011 годзе «электронным» спосабам скарысталася ўжо больш за 15% выбаршчыкаў.

У тыя дні эстонскі парламент актыўна абмяркоўваў папраўкі ў закон «Аб замежніках», каб даць магчымасцяў атрымання віду на жыхарства. Незайздросная дэмаграфічная сітуацыя прымушае адважвацца на такія крокі нават самых жорсткіх прыхільнікаў нацыянальнай ідэі.

— Дзяржава добра падтрымлівае нашы нацыянальныя меншасці, — гаворыць віцэ-спікер парламента Лайна Райндзяў, — А беларуская суполка ў нас — адна з актыўнейшых. І яна робіць добрую працу. Дапамагае будаваць культурны мост паміж нашымі краінамі. Па такім трывалым мосце можна прайсці далёка і па іншых кірунках супрацоўніцтва.

Уваход у гарадскую мэрыю незвычайны: кветкі, стосы бясплатных газет і даведак, нават цукеркамі бясплатна можна паласавацца. І мноства кабінак, дзе прымаюць наведвальнікаў чыноўнікі. Звярнуўся хто ў мэрыю з пытаннем, якое можна адправіць нават з мабільніка — табе назначаць час прыёму вось тут, не пасылаючы па паверхах і службовых кабінетах. Тут яго і вырашаць, хадзіць нікуды больш не трэба.

Цікавая ідэя мэрыі — увядзенне бясплатнага праезду для гараджан. Віцэ-мэр Тааві Аас расказаў, што сітуацыя з гарадскім транспартам у іх была падобнай на нашу. Транспартнікі скардзіліся на нястачу сродкаў. Горад пакрываў пад 70% выдаткаў, астатнюю частку атрымлівалі ад продажу праязных дакументаў. Палічылі, што зручней будзе наогул узяць поўную аплату транспарту на сябе. Не траціцца на друкоўку білетаў, на арганізацыю іх продажу, на кантралёраў.

**На працягу 2003-2008 гадоў з Беларусі ў Эстонію выехалі 79 афіцыйных мігрантаў. З Эстоніі ў Беларусь — 212 чалавек.**

Праўда, талінцы, заходзячы ў транспарт, павінны абавязкова прыкласці да электроннага чыпа сваё пасведчанне аб рэгістрацыі. І, пачуўшы пра гэтыя правілы, у горадзе зарэгістравалася амаль шэсць тысяч новых жыхароў — з'явілася яшчэ шэсць тысяч новых падаткаплацельшчыкаў. І лічба працягвае расці. Бывае, па 100 на дзень дабаўляецца людзей, якія жылі і працавалі ў сталіцы, але чамусьці не спяшаліся станавіцца талінцамі фармальна. Улічваючы, што гарадскі бюджэт тут фарміруецца толькі з падаткаў, — тэндэнцыя добрая. Вось так амаль усе грошы на транспарт, якіх не хапала, і знайшліся.

— Мы павінны зрабіць новыя крокі, пэўную «перазагрузку» адносін, самы час, — гаворыць кіраўнік рабочай групы Палаты прадстаўнікоў па супрацоўніцтве з парламентам Эстоніі Мікалай Іванчанка. — І будзе плён, я асабіста бачу шмат новых цікавых магчымасцяў.

—У такіх сустрэч добрая перспектыва, — гаворыць Максім Дубянок. — Мы плануем правесці падобныя мерапрыемствы ў Латвіі, Літве, Расіі, ды і малдаўскія беларусы звярталіся з такой ідэяй.

Але гэты рух знізу, відаць, трэба падмацоўваць і крокамі на дзяржаўным узроўні. Наспеў час паўнавартаснага закона ці праграмы падтрымкі нашых суайчыннікаў за мяжой. Як дарэчы, у гэтым годзе зрабілі ў Латвіі. Там прынялі закон, які прадугледжвае і матэрыяльную падтрымку сваіх дыяспар. Сітуацыя вымушае. Як расказала дэпутат Алена Лазарава, дарэчы, адзіная этнічная беларуска ў сённяшнім латвійскім парламенце, — насельніцтва іх краіны імкліва змяншаецца. А толькі ў мінулым годзе ў Англіі і Ірландыі ў латышоў, якія там пражываюць, нарадзілася па дзве тысячы немаўлят. Гэтыя дзеці і па нацыянальнасці маглі б быць запісаны бацькамі як англічане ці ірландцы. Але запісалі іх менавіта латышамі. Бацькі хочуць, каб дзеці захавалі сувязь з радзімай. І за падобныя патрыятычныя крокі суайчыннікаў радзіма павінна быць больш удзячнай.

Як і наша таксама.

**Вікенцій КЛЮЧНІК.**

*Талін — Мінск*

# З чаго пачынаецца пасняховая гаспадарка?

**Раслінаводства і жывёлагадоўля — хоць і няпростыя галіны, але прыбытковыя. Гэта даказвае прыклад**

**АДКРЫТАГА АКЦЫЯНЕРНАГА ТАВАРЫСТВА «17 ВЕРАСНЯ»**

**з Нясвіжскага раёна, якое спецыялізуецца на вытворчасці збожжа і малака.**

**ААТ «17 Верасня» размешчана на адлегласці каля 130 км ад Мінска і за 18 км ад Нясвіжа. Цэнтральная сядзіба гаспадаркі — вёска Высокая Ліпа.**

## ДЛЯ ПАВЫШЭННЯ РЭНТАБЕЛЬНАСЦІ ВАЖНА ВЫКАРЫСТАЦЬ УСЕ РЭЗЕРВЫ

Летась гэтая гаспадарка заняла другое месца ў раёне па ўраджайнасці збожжавых, якая склала 77,9 цэнтнера з гектара.

«Вялікую ўвагу мы надаём таксама кармавым культурам — у прыватнасці, кукурузе, — распавядае **намеснік дырэктара ААТ «17 Верасня» Віктар ХУДНІЦКІ.** — Дзякуючы таму, што пры яе апрацоўцы выкарыстоўваюцца перадавыя тэхналогіі, строга выконваюцца агратэхнічныя нормы, а парк машын папаўняецца высокапрадукцыйнай сельскагаспадарчай тэхнікай, яе ўраджаі стабільна высокія».

***

У жывёлагадоўлі гаспадарка спецыялізуецца на вытворчасці малака, вырошчванні племянных цёлак для ўзнаўлення статка і рэалізацыі іншым гаспадаркам. Зараз тут 1220 галоў кароў з сярэднегадавым удоем 6505 кг. Для іх утрымання ствараюцца належныя ўмовы, без чаго сёння галіна не можа быць эфектыўнай. Так, у цяперашні час вядзецца рэканструкцыя малочнатаварнай фермы на тысячу галоў. А ў раёне вёскі Круты Бераг пачата будаўніцтва першай чаргі новай жывёлагадоўчай фермы. Мясцовыя спецыялісты ўпэўнены: рэзервы па нарошчванні вытворчасці малака яшчэ ёсць!

**Плошча сельгасугоддзяў гаспадаркі складае 4267 га, у тым ліку 3243 га раллі.**



Сямейная дынастыя ЗЯНЬКО: Мікалай, Ігар і Дзмітрый.



Гаспадарка з года ў год выконвае практычна ўсе даведзеныя паказчыкі. «У мінулым годзе па росце валавой прадукцыі заданне складала 110,6%, мы яго выканалі на 113,7%, — кажа **галоўны эканаміст гаспадаркі Марыя МАКСІМЧЫК.** — Паказчык па энергазберажэнні складаў мінус 5,5%. Мы зберaглі дадаткова 15,9% энергіі». А на наша пытанне, як удалося гэта зрабіць, адказвае: «Гэта ўсё эканомія і беражлівасць». І тлумачыць: «Шмат у чым гэта адбылося дзякуючы таму, што мы павялічылі вытворчасць прадукцыі — таму расход паліўна-энергетычных рэсурсаў на адзінку прадукцыі паменшыўся. Павялічылася таксама і доля мясцовых паліўна-энергетычных рэсурсаў (дроў, пілавіння), якія ў кацельна-пячным паліве цяпер складаюць амаль 50%. І гэта, як бачыце, прынесла свой плён».

Больш чым на 15% звыш запланаванага склала летась і рэнтабельнасць продажу (замест неабходных 5% яна вырасла на 20,6%). Разам з тым, кіраўніцтва гаспадаркі сціпла заўважае, што яны яшчэ не самыя перадавыя і што ўвесь раён мае добрыя паказчыкі...



Да канца года плануецца скончыць будаўніцтва новай малочнатаварнай фермы ў вёсцы Круты Бераг.

## «ЛЕТАМ ЧАСТА ДАВОДЗІЦЦА ПРАЦАВАЦЬ АД ЦЯМНА І ДА ЦЯМНА, АЛЕ МЫ НЕ СУПРАЦЬ: ГЭТА Ж НАШ ЗАРОБАК»

Ігар Зянько разам з двума сваімі сынамі працуе ў ААТ «17 Верасня» вадзіцелем «МАЗа». Нарадзіўся ён у суседняй вёсцы Вялікая Ліпа — там жывуць бацькі. Сам Ігар Іванавіч у Высокай Ліпе жыве ўжо 7 гадоў, а ў гаспадарцы працуе 20 гадоў.

Яго старэйшы сын Дзмітрый крыху больш за год таму вярнуўся з арміі, у яго ўжо свая сям'я. Пакуль жыве з бацькамі, але гаспадарка будуе ім жыллё. «Яму паабяцалі вунь той дом...» — старэйшы Зянько паказвае рукой уздоўж вуліцы. Жонка Дзмітрыя цяпер у дэкрэтным водпуску, а раней працавала ў Мінску. «Будзем яе сюды пераводзіць», — усміхаецца Дзмітрый. Калі дзіцяці споўніцца тры гады, яго без праблем можна будзе ўладкаваць у дзіцячы садок, які размешчаны побач. Як, дарэчы, і школа.

«Мне падабаецца ў вёсцы: тут спакойна, свежае паветра, — кажа Дзмітрый. — Я ў сталіцы ў арміі служыў, мне прапаноўвалі застацца там на кантрактнай аснове, але я не захацеў: дома лепш».

«Зімой вольнага часу больш, а летам часта даводзіцца працаваць ад цямна і да цямна. Але мы не супраць: гэта ж наш заробак, і ён ад нас залежыць. Дзе б ні працаваў, калі хочаш працаваць, то грошы заробіш», — кажа Зянько-старэйшы.

Усяго ў гаспадарцы зараз працуюць 309 чалавек. «Былі часы, калі працавалі і паўтары тысячы», — успамінаюць старажылы. Вядома, ад'язджае моладзь, як бы ні казалі, што вёска становіцца ўсё бліжэй да горада. Але ёсць і тыя, хто застаецца. А дзякуючы сучаснай тэхніцы і аптымізацыі колькасці работнікаў патрэбнасць гаспадаркі ў людзях паступова памяншаецца.

Тым не менш, маладых спецыялістаў тут стараюцца затрымаць. Практычна ўсіх іх забяспечваюць жыллём. «У нас ёсць два пяціпавярховыя дамы, — кажа Марыя Максімчык. — Адзінокіх засяляем па два чалавекі ў кватэру, сямейным даём асобную кватэру».

У мінулым годзе тут пачата будаўніцтва двух дамоў: адна- і двухкватэрнага — для трох сем'яў. Плануюць на днях, у канцы лютага, здаць двухкватэрны дом, у якім атрымаюць новае жыллё дзве маладыя сям'і.

***

Ад'язджаюць тыя, хто хоча лёгкага жыцця, лічаць вяскоўцы. Бо праца ў сельскай гаспадарцы — гэта ненарміраваны працоўны дзень. Калі пачынаецца пасяўная — з вясны і да позняй восені людзі працуюць з раніцы і да ночы. Можна, вядома, прапісаць, што абед з 14 да 15 гадзін, але гэта не значыць, што так яно і будзе. Часам даводзіцца паабедаць і за 15 хвілін... Тым не менш, у ААТ «17 Верасня» створана зладжаная «баяздольная» каманда на чале з **дырэктарам Андрэем КОКТЫШАМ.**

«Дрэнна пра яго ні адзін чалавек вам не скажа, — запэўніваюць вяскоўцы. — Малады, перспектыўны... Спачатку прыехаў пасля заканчэння Гродзенскага сельскагаспадарчага ўніверсітэта працаваць заатэхнікам. Праз тры гады яго запрасілі ў Карэлічы працаваць намеснікам начальніка ўпраўлення сельскай гаспадаркі па жывёлагадоўлі. А тры гады таму папрасілі вярнуцца ў ААТ «17 Верасня» ўжо ў якасці кіраўніка». Свайго кіраўніка людзі ў адзін голас называюць патрабавальным, але справядлівым.



Галоўны ветэрынарны ўрач Валерый ЯРОЦКІ на ферме па адкорме бычкоў у вёсцы Завушша.

Зернесушыльны комплекс.



## БУДЗЕМ ДУМАЦЬ ПРА ЛЮДЗЕЙ — БУДЗЕ АДДАЧА

Эканамічная стабільнасць прадпрыемства дае магчымасць пераўтвараць інфраструктуру вёскі, набліжаць яе да гарадскіх параметраў. Першае, на што звяртаеш увагу, прыязджаючы ў цэнтральную сядзібу гаспадаркі — вёску Высокая Ліпа, — гэта парадак, чысціня і дагледжанасць.

Кіраўніцтва стараецца, каб работнікі наведвалі ўсе культурныя мерапрыемствы, якія праходзяць у Нясвіжы, і асабліва музычныя фэсты, якія вельмі любіць моладзь. Рэгулярна арганізоўваюцца гаспадаркай самыя розныя паездкі: у Жыровіцкі манастыр, у Хмяльніцкі, на хакейныя турніры.

«Зімой купляем абанементы і возім людзей у басейн, што размешчаны паблізу — у Снове. Улетку нашы дзеці аздараўляюцца ў лагерах, — пералічвае галоўны эканаміст. — Пуцёўкі аплачваем цалкам. Гэтак жа, як і пуцёўкі для дарослых у санаторыі. Тыя, у каго ёсць праблемы са здароўем, могуць скарыстацца такой магчымасцю без праблем».

Дапамагае адкрытае акцыянернае таварыства «17 Верасня» таксама мясцовым школе і дзіцячаму садку. Усё ж такі там нашы дзеці, лічаць у гаспадарцы. Пенсіянерам, ветэранам уручаюць ад гаспадаркі харчовыя пайкі да свят. З разуменнем ставяцца, калі трэба дапамагчы царкве або касцёлу. Прычым не толькі мясцовым — гаспадарка пералічвае ахвяраванні на будаўніцтва храмаў у самых розных кутках краіны. Тут усё імкнуцца рабіць па-чалавечы і лічаць, што разам людзі здольныя на многае: і напасці любыя могуць адолець, і змяніць жыццё да лепшага.

*УНП 600038416*

---

Таварыства з абмежаванай адказнасцю

# «Корсак»: Сакрэт поспеху нясвіжскага прадпрыемства

Гаворачы аб Нясвіжы, большасць адразу ўспомніць замак Радзівілаў, краязнаўчы музей ці родныя мясціны Якуба Коласа. Аднак гэты выдатны горад знакаміты яшчэ і мэблевым прадпрыемствам, створаным у 1997 годзе і названым па прозвішчы свайго арганізатара «Корсак». І гэтая знакамітасць невыпадковая: усяго за 15 гадоў ініцыятывы аднаго чалавека выраслі ў 3 вытворчыя пляцоўкі, 8 фірменных крам, 100 гандлёвых партнёраў і больш за 240 супрацоўнікаў. «Корсак» вырабляе і прапануе пад уласным брэндам як мяккую, так і корпусную мэблю — у прыватнасці, кухні. Гандлёвая марка «Корсак» шырока вядомая не толькі на беларускім рынку, але і за мяжой. У Маскве актыўна працуе ўласны філіял кампаніі «Корсак», стабільна здзяйсняюцца пастаўкі ў Казахстан і Узбекістан. Чым жа асабліва характэрна і выгадна адрозніваецца ад канкурэнтаў мэбля «Корсак»? Адказваючы на гэтае пытанне, варта вылучыць шэсць асаблівасцяў гэтай гандлёвай маркі:

- высокая функцыянальнасць, практычнасць кожнай мадэлі;
- індывідуальны падыход і ўважлівае стаўленне да заказчыка: у кожнай краме, дзе прадстаўлена прадукцыя прадпрыемства, пакупнік можа зрабіць заказ упадабанай мадэлі ў любой камплектацыі і адпаведны выбар тканіны;
- сучасны дызайн: над распрацоўкай новых мадэляў працуюць прафесійныя дызайнеры, якія ўлічваюць перадавыя тэндэнцыі мэблевай моды і сусветны вопыт;
- выкарыстанне высакаякасных, надзейных і экалагічна чыстых матэрыялаў;
- выкарыстанне камплектуючых лепшых айчынных і замежных вытворцаў;
- уся прадукцыя сертыфікавана.



Дырэктар ТАА «Корсак» Вячаслаў КОРСАК.

Каб пераканацца ва ўсім сказаным, мы разам з дырэктарам прадпрыемства Вячаславам Вацлававічам Корсакам накіраваліся непасрэдна на вытворчыя пляцоўкі.

## Мэбля, як і жыццё, складаецца з мноства дэталяў і нюансаў

Першым памяшканнем, якое мы наведалі, быў цэх па вырабе корпуснай мэблі. Яркае ўражанне пры наведванні ўсіх цэхаў робіць адзінства стылю, вытрыманае ва ўсім — ад колеру сцен і спецадзення да фірменнага скотча на ўпакоўцы гатовага вырабу. Дробязяў тут не прызнаюць, упэўнены: выварат сведчыць аб якасці вырабу не менш, чым вонкавы бок. Цэх корпуснай мэблі адразу ўразіў памерамі дарагога нямецкага абсталявання для вырабу любых дэталяў. Многія з гэтых машын дазваляюць істотна сэканоміць час, рэсурсы і колькасць рабочых, задзейнічаных раней на гэтым жа ўчастку працы. Вячаслаў Вацлававіч звярнуў асаблівую ўвагу на тое, наколькі сур'ёзна на прадпрыемстве ставяцца да тэхнікі бяспекі. І сапраўды: усе спецыялісты працуюць у навушніках, абсталяванне і працоўныя месцы арганізаваны такім чынам, што ніхто нават выпадкова не можа пацярпець. У цэлым стаўленне да дабрабыту кожнага супрацоўніка на яго працоўным месцы — важная рыса гэтага прадпрыемства.

Корпусная мэбля займае каля 15% ад аб'ёму вытворчасці прадпрыемства ў грашовым вымярэнні, але стаўленне да яе вытворчасці больш чым сур'ёзнае. У кожнай краме, дзе прадстаўлены кухні «Корсак», пакупнік можа выбраць практычна любыя матэрыялы і расфарбоўкі для сваёй кухні. Рэальнасць такая, што ў нашы дні ўсё больш людзей хочуць самі быць «рэжысёрамі» для ўласных кухняў. Асартымент мадэляў і якасць прадукцыі, якая вырабляецца ў цэху корпуснай мэблі, цалкам задавальняе любым пажаданням і попыту.

Асобную вытворчую пляцоўку займаюць цэхі па вырабе мяккай мэблі. Тут пануе прыемны пах свежаспілаванага лесу. Спачатку мы праходзім па доўгім памяшканні, дзе ўстаноўлена дарагое сучаснае абсталяванне і паліцы для нарыхтовак вызначаных памераў і мадэляў. Пасля цэха драўляных нарыхтовак мы трапляем у памяшканне, дзе адбываецца выраб каркасаў для мяккай мэблі, а далей — і набіванне, якое ажыццяўляецца ўручную вопытнымі майстрамі.

Фірменная крама ў Нясвіжы па вуліцы Ленінская, 157









Спецыяльная грашовая прапанова на канапу-ложак «Манака»!

**ВЯСЕННІЯ ЗНІЖКІ:**
**10%** на ўсю мяккую мэблю
і **15%** на ўсе мадэлі корпуснай мэблі.
Падрабязнасці ў фірменных крамах.

## Галоўнае — не стаяць на месцы

Калі абышлі ўсе вытворчыя памяшканні і ўважліва вывучылі асартымент у фірменных крамах, у нас паўстала лагічнае і відавочнае пытанне да дырэктара прадпрыемства Вячаслава Вацлававіча Корсака: «Падзяліцеся, у чым сакрэт такога поспеху; дзякуючы чаму ўсяго за 15 гадоў удалося з нуля стварыць пасняховае прадпрыемства, якое актыўна развіваецца?». Вячаслаў Корсак адказаў проста, але ўпэўнена: «Можна шмат усяго сказаць, але калі быць лаканічным... Неабходна мець тры складнікі: укласці ў сваю справу рукі, сэрца і не стаяць на месцы ...».

Усё гэта ў прадпрыемства атрымліваецца выдатна. Складскія памяшканні на прадпрыемстве штодня спусташаюцца і папаўняюцца новай мэбляй; тавар не тое што не паспявае заляжацца — разыходзіцца даволі хутка. Адсюль адна з галоўных задач і мэт кампаніі «Корсак» — спачатку нарасціць аб'ёмы, пашырыць вытворчую базу, зрабіць асартымент прадукцыі яшчэ больш разнастайным, пасля чага лагічна ўзнікае наступная мэта — пошук новых рынкаў збыту, адкрыццё дадатковых крам.



Намеснік дырэктара па камерцыйных пытаннях Віталь ПІЛЯК распавядае пра асаблівасці і модныя тэндэнцыі абівачных тканін.

Мы змаглі пераканацца ў тым, што прадпрыемства асноўны ўпор робіць на якасць усёй прадукцыі, якая вырабляецца, што часам абыходзіцца нятанна. Мне здаецца, што з гэтага вынікае яшчэ адзін невялікі, але важны сакрэт поспеху ў бізнэсе — быць арыентаваным на свайго пакупніка і дакладна ведаць, чаго той хоча. Тут Вячаслаў Корсак заўважыў: «Беларускі пакупнік — гэта грунтоўны пакупнік, які ўважліва вывучае асартымент і якасць прадукцыі. Сярод беларусаў ёсць шмат тых, хто выбірае дыхтоўныя рэчы, якія служылі б доўга, і гэта прыемна вылучае наш народ сярод іншых...». У заключэнне хочацца дадаць простую, але відавочную для грунтоўнага пакупніка параду: выбіраючы якасць надоўга — шукай мэблю ад «Корсака».

Дырэктар фірменнай крамы Галіна ГРУДЗІНСКАЯ.



**Адрасы фірменных крам «Корсак-ВВ»:**

г. Магілёў, вул. Першамайская, 9/2; тэл.: (+375 222) 25-05-84
г. Магілёў, вул. Габроўская, 41, тэл.: 8 (029) 149-76-36
г. Мінск, вул. Багдановіча, 124, тэл.: (+375 17) 280-36-66
г. Мінск, вул. Матусевіча, 35, тэл.: 8 (029) 150-87-14
г. Брэст, вул. Карбышава, 74; тэл.: (+375 162) 23-52-69, 21-17-82
г. Баранавічы, вул. Фабрычная, 18, тэл.: 8 (029) 157-76-42
г. Гродна, вул. Багуцкага, 5/2, тэл.: (+375 152) 432153
г. Нясвіж, вул. Ленінская, 157; тэл.: (+375 1770) 5-92-16, 5-92-35
Вэб-сайты: www.korsak.by, www.almatti.by

**Матэрыялы падрыхтавалі: Святлана БУСЬКО, Алена ЛОБАШАВА, Вольга ГЕЦЭВІЧ.**
**Фота Марыны БЕГУНКОВАЙ, Любові БЯЛЯЕВАЙ.** *УНП 690255292*

Наблюдательный совет

# ОАО «Белхозторг»

**ИЗВЕЩАЕТ О СОЗЫВЕ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА.**

**Собрание состоится 29 марта 2013 года в 14.00 по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 34, кабинет 401.**

**Повестка дня очередного собрания акционеров:**

1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности в 2012 г. и основных направлениях развития ОАО «Белхозторг» на 2013 год.
2. Утверждение годового баланса и отчета о прибылях и убытках за 2012 г.
3. О распределении прибыли, остающейся в распоряжении Общества за 2012 год. Установление размера дивидендов за 2012 год.
4. Установление периодичности и порядка выплаты дивидендов за 2013 г.
5. Определение срока выплаты дивидендов за 2012 г.
6. Утверждение направлений использования чистой прибыли, остающейся в распоряжении Общества на 2013 год.
7. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Белхозторг» за 2012 г.
8. О работе Наблюдательного совета в 2012 году.
9. Избрание нового состава Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
10. О вознаграждении членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
11. Об утверждении и внесении изменений в Устав ОАО «Белхозторг».

С информацией, подлежащей рассмотрению на очередном собрании акционеров, можно ознакомиться на сайте Общества в глобальной компьютерной сети Интернет, Форуме и информационном стенде ОАО «Белхозторг» по адресу: **г. Минск, ул. Платонова, 34, 4-ый этаж.**

Регистрация участников собрания **29 марта 2013 года — с 12.30 до 13.50 по месту проведения собрания.**

Дата составления списка акционеров — **5 марта 2013 г.**

Для регистрации при себе иметь:
- акционеру Общества — документ, удостоверяющий личность;
- представителю акционера — документ, удостоверяющий личность, и доверенность.

УНП 100230626 *Наблюдательный совет*

**ИЗВЕЩЕНИЕ**

**УВАЖАЕМЫЕ АКЦИОНЕРЫ!**

# ОАО «БЕЛФА» г. ЖЛОБИН

**ИЗВЕЩАЕТ О ПРОВЕДЕНИИ 28 марта 2013 г. ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Итоги финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2012 год и основные направления развития на 2013 год.
2. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2012 год. Утверждение годового баланса и отчета о прибылях и убытках за 2012 год.
3. Об использовании чистой прибыли, полученной в 2012 году, и выплате дивидендов за 2012 год.
4. Утверждение нормативов использования чистой прибыли на 2013 год.
5. Об увеличении уставного фонда Общества.
6. О внесении изменений в Устав Общества.
7. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи юридическим лицам.
8. Утверждение размеров вознаграждения членам наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
9. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.

Собрание состоится в конференц-зале Общества по адресу: **Гомельская обл., г. Жлобин, Красный проезд, 2. Начало в 14.00.**

Регистрация участников собрания **с 12.00 до 13.45.**

Для регистрации при себе иметь следующие документы:

Акционеру Общества – паспорт;
представителю акционера – паспорт и доверенность.

Список лиц, имеющих право на участие в общем собрании составляется на основании данных реестра владельцев акций по состоянию на 1 марта 2013 года.

С материалами по проведению собрания можно ознакомиться по месту нахождения Общества **с 20 марта 2013 года.**

*Наблюдательный совет.*

Наблюдательный совет

# ОАО «Белхозторг»

**ИЗВЕЩАЕТ О СОЗЫВЕ ВНЕОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ ОБЩЕСТВА.**

**Собрание состоится 11 марта 2013 года в 15.00 по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 34, кабинет 401.**

**Повестка дня внеочередного общего собрания акционеров:**

1. О принятии участия в создании Ассоциации оптовых организаций «Белоптторг».

С информацией, подлежащей рассмотрению на внеочередном собрании акционеров, можно ознакомиться на сайте Общества в глобальной компьютерной сети Интернет, Форуме и информационном стенде ОАО «Белхозторг» по адресу: г. Минск, ул. Платонова, 34, 4-ый этаж.

Регистрация участников собрания **11 марта 2013 года — с 13.30 до 14.45 по месту проведения собрания.**

Дата составления списка акционеров — **5 марта 2013 г.**

Для регистрации при себе иметь:
- акционеру Общества — документ, удостоверяющий личность;
- представителю акционера — документ, удостоверяющий личность, и доверенность.

УНП 100230626 *Наблюдательный совет*

**Наблюдательный совет открытого акционерного общества**

## «Дорожно-строительный трест № 2, г. Гомель»

**сообщает о проведении годового собрания акционеров, которое состоится 29 марта 2013 года в зале заседаний ДСУ-17 по адресу: г. Гомель, Инженерный переулок, д. 6.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Отчет генерального директора о финансово-хозяйственной деятельности ОАО «ДСТ № 2, г. Гомель» и выполнении прогнозных показателей за 2012 год, принятие параметров прогноза социально-экономического развития ОАО «ДСТ № 2, г. Гомель» на 2013 год.
2. Отчет ревизионной комиссии по результатам годовой проверки и аудиторского заключения деятельности ОАО «ДСТ № 2, г. Гомель» и Наблюдательного Совета о проделанной работе в 2012 году.
3. Утверждение годового отчета за 2012 год, бухгалтерского баланса, отчета о прибылях и убытках.
4. Утверждение распределения чистой прибыли по итогам 2012 года и направлений ее использования в 2013 году, размера и сроков выплаты дивидендов за 2012 год. Выплата дивидендов в 2013 году.
5. Избрание членов Наблюдательного Совета.
6. Избрание членов ревизионной комиссии.
7. Определение условий материального вознаграждения членам Наблюдательного Совета и ревизионной комиссии.
8. Об увеличении размера уставного фонда.
9. О внесении изменений в Устав общества и изложение его в новой редакции.

Регистрация участников собрания **с 10.00.** Начало собрания **в 11.00.**

Дата составления списка акционеров, имеющих право на участие в собрании, — **27 февраля 2013 г.**

С собой иметь документ, удостоверяющий личность акционера, представителям — доверенности.

УНП 400022426

Открытое акционерное общество

## «Дорожно-строительный трест № 3»

**сообщает о проведении очередного собрания акционеров, которое состоится 29 марта 2013 года в 11.00 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

**ПОВЕСТКА ДНЯ:**

1. Утверждение годового отчета, бухгалтерского баланса, счетов прибыли и убытков ОАО «ДСТ № 3» за 2012 год.
2. Отчет ревизионной комиссии о результатах проверки финансовой и хозяйственной деятельности ОАО «ДСТ № 3» за 2012 год.
3. О распределении чистой прибыли и дивидендов за 2012 год.
4. Утверждение основных направлений деятельности ОАО «ДСТ № 3» на 2013 год.
5. О распределении чистой прибыли на 2013 год.
6. Выборы членов Наблюдательного совета и ревизионной комиссии.
7. Об утверждении размера вознаграждений и компенсаций расходов членам Наблюдательного совета, ревизионной комиссии Общества за исполнение ими своих обязанностей.
8. О внесении изменений в Устав ОАО «ДСТ № 3».

Регистрация лиц, имеющих право на участие в собрании, будет проводиться **29.03.2013 г. с 10.00 до 10.45 по адресу: г. Могилев, ул. Космонавтов, 23.**

Дата составления списка лиц, имеющих право на участие в собрании, — 05.03.2013 г.

Лицам, имеющим право на участие в собрании, можно ознакомиться с материалами к собранию по адресу: **г. Могилев, ул. Космонавтов, 23, каб. 40.**

Лицам, имеющим право на участие в собрании, при себе иметь документ, удостоверяющий личность (для представителей акционеров — доверенности, зарегистрированные в соответствии с «Инструкцией о порядке регистрации доверенностей, предусматривающих передачу прав, удостоверенных акциями», утвержденной постановлением Совета Министров Республики Беларусь от 30.08.2006 г. № 1093).

Справки по телефонам: **23 64 24, 23 64 87 —**
Отдел экономического анализа и прогнозирование.

УНП 700049607 ***Наблюдательный совет.***

**ЗАО «Агрэст» ИНФОРМИРУЕТ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ 30 марта 2013 г. в 10.00 по адресу: г. Минск, ул. Филимонова, 2.**
**Повестка дня:** подведение итогов работы за 2012 год, утверждение годового бухгалтерского баланса, утверждение новой редакции Устава, разное.

УНП 100266857

**УТВЕРЖДЕНО**
Правление Фонда «Мерси»
26.02.2013

**СОГЛАСОВАНО**
Попечительский совет Фонда «Мерси»
26.02.2013

## Отчет за 2012 год по использованию Местным благотворительным фондом «Мерси» своего имущества

| № | Наименование сведений | Количество/ ден. сумма, бел. руб. | Примечание |
|---|---|---|---|
| 1 | информация о количестве учредителей фонда | один | А.А.Парфенчик |
| | информация о стоимости имущества фонда, в том числе: | | |
| 2 | имущество, переданное учредителем фонда, а именно: деньги | 3 500 000 бел. руб. | |
| 3 | поступления от проводимых в соответствии с уставом фонда мероприятий, а именно: | нет | |
| 4 | доходы, полученные от осуществляемой в соответствии с уставом фонда предпринимательской деятельности | нет | |
| 5 | иные не запрещенные законодательством Республики Беларусь поступления, а именно: пожертвования физических лиц, безвозмездная (спонсорская) помощь юридических лиц | 62 194 598 бел. руб. | |
| 6 | информация об общей сумме расходов, понесенных фондом на достижение общественно полезных целей, указанных в его уставе | 51 570 948 бел. руб. | |
| 7 | информация о количестве унитарных предприятий, хозяйственных обществ, созданных фондом для осуществления предпринимательской деятельности, в том числе об участии фонда в таких юридических лицах | нет | |

Директор А.А. Парфенчик
26.02.2013

**Открытое акционерное общество**

## «Минсктелекомстрой»

**ИЗВЕЩАЕТ СВОИХ АКЦИОНЕРОВ О ПРОВЕДЕНИИ ОЧЕРЕДНОГО ОБЩЕГО СОБРАНИЯ АКЦИОНЕРОВ 29 марта 2013 года.**

**Собрание состоится по адресу: Минская обл., г. Борисов, ул. Панфилова, 47, актовый зал.**

**Регистрация участников собрания с 11.00 до 11.50 по месту проведения собрания. Начало работы собрания в 12.00**

**ПОВЕСТКА ДНЯ СОБРАНИЯ:**

*1. Об итогах финансово-хозяйственной деятельности ОАО «Минсктелекомстрой» за 2012 год и основных направлениях деятельности Общества на 2013 год.*
*2. О работе наблюдательного совета в 2012 году.*
*3. О результатах аудиторской проверки и проверки ревизионной комиссией финансово-хозяйственной деятельности Общества за 2012 год.*
*4. Утверждение годового отчета финансово-хозяйственной деятельности и баланса Общества.*
*5. Утверждение распределения чистой прибыли за 2012 год и направлениях использования чистой прибыли на 2013 год.*
*О выплате дивидендов в 2013 году.*
*6. Об изменении размера уставного фонда ОАО «Минсктелекомстрой».*
*7. О внесении изменений и дополнений в Устав ОАО «Минсктелекомстрой».*
*8. Избрание членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии Общества. О вознаграждении членов наблюдательного совета и ревизионной комиссии.*
*9. О предоставлении безвозмездной (спонсорской) помощи в 2013 году.*

